Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЖНІЎНЯ 2020 г. СЕРАДА № 150 (29264)

Прэзідэнт Беларусі звярнуўся з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу

# «Мы сёння моцна трымаем у руках сваю будучыню. Будучыню незалежнай Беларусі»

**Сёлета штогадовы зварот кіраўніка дзяржавы — яго яшчэ называюць канстытуцыйным, бо ён прапісаны ў Асноўным Законе Беларусі — адбыўся ў незвычайным месцы і ў незвычайны час. Але і сам 2020 год — адметны: загадзя мы, беларусы, ведалі толькі, што ён электаральны, а ўсё астатняе стала нечаканым выпрабаваннем, і не толькі для нас. Менавіта сусветная пандэмія і нявызначанасць яе наступстваў не дазволілі кіраўніку дзяржавы звярнуцца да народа і Нацыянальнага сходу ў красавіку, як планавалася раней. У выніку гэта адбылося за некалькі дзён да выбараў, і не ў Авальнай зале Дома ўрада, а ў Палацы Рэспублікі. У вялікай зале палаца пасланне Прэзідэнта слухалі больш за 2,5 тысячы чалавек: акрамя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, вышэйшыя службовыя асобы, члены ўрада, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, найбуйнейшых прадпрыемстваў, прадстаўнікі дыпкорпуса.**



Фота БелТА.

## НА ГЕАПАЛІТЫЧНЫМ РАЗЛОМЕ Ў НЕСПАКОЙНЫ ЧАС

Невыпадкова менавіта з геапалітычнага фону, на якім адбываецца Пасланне, пачаў кіраўнік дзяржавы. Ён згадаў не толькі глабальную эпідэмію новага віруса, якая забрала сотні тысяч жыццяў па ўсёй планеце, але і падзенне цэн на нафту, глабальны эканамічны крызіс, сусветную хвалю пратэстаў і ўзброеных канфліктаў, новае выпрабаванне на трываласць для Еўрапейскага саюза. Усе гэтыя падзеі, на думку Аляксандра Лукашэнкі, даюць падставу заявіць аб безальтэрнатыўнай ролі моцнай дзяржавы ў жыцці нацыі.

*«Каб зразумець, што адбываецца з намі, трэба разумець, што адбываецца вакол нас,* — сказаў ён. — *Свет глабалізуецца, ступень узаемазалежнасці паміж дзяржавамі няўхільна расце. Агульнасусветныя выклікі і пагрозы закранаюць абсалютна ўсе дзяржавы свету без выключэння. У тым ліку і нас. Нават калі прырода іх узнікнення і прычыны зарадзіліся за тысячы кіламетраў ад нашых беларускіх межаў».*

Беларусь, якая знаходзіцца ў самым цэнтры Еўропы, — паўнавартасны ўдзельнік усіх асноўных міжнародных працэсаў. Трывалымі гандлёва-эканамічнымі ніцямі яна звязана з усімі рэгіёнамі свету. Менавіта таму сённяшнюю сітуацыю даводзіцца разглядаць у кантэксце міжнародных адносін.

*«Для нас відавочна, што свет становіцца ўсё больш нестабільны і непрадказальны. Наколькі — ніхто сёння прадказаць не зможа. Прынцыповыя супярэчнасці паміж дзяржавамі і блокамі, назапашаныя за апошнія дзесяцігоддзі, пераходзяць у вострую канфліктную стадыю. За апошні час канчаткова ні адна з найважнейшых міжнародных праблем не была вырашана. Пандэмія агаліла ўсе сістэмныя праблемы. Гэтая тэма фактычна стала прыкрыццём для бесцырымоннай рэалізацыі асноўнымі сусветнымі гульцамі сваіх знешнепалітычных і гандлёва-эканамічных амбіцый. Прычым метадамі рознымі, не грэбуюць нічым, вы гэта назіраеце»,* — адзначыў беларускі лідар.

Па яго словах, жорсткае супрацьстаянне па ўсіх франтах разгарнулася паміж найбуйнейшымі эканомікамі свету — ЗША, якія на працягу апошніх дзесяцігоддзяў фактычна з'яўляліся аднаасобным сусветным лідарам, і Кітаем, які ўварваўся ў сусветную эліту і выступае за рэальную шматпалярнасць. Убаку ад гэтых працэсаў не засталіся Расія і Еўрапейскі саюз, якія таксама прэтэндуюць на галоўныя ролі.

*«Словам, трасе ўсю планету. Пры тым што Японія, Карэя, Бразілія, Індыя, арабскі свет і шэраг іншых вядучых эканомік свайго слова яшчэ не сказалі. Пакуль не сказалі. Увесь свет пагрузіўся ў хаос гандлёвых войнаў, нацыянальнага пратэкцыянізму, палітычнага і інфармацыйнага супрацьстаяння. Інтэграцыйныя структуры перажываюць сістэмны крызіс. Некаторыя ўвогуле разваліліся і існуюць толькі на паперы. Наймагутнейшым індыкатарам гэтага працэсу ў ЕС стаў «брэксіт», а таксама абвастрэнне ўнутры саюза супярэчнасцяў паміж старой і новай Еўропай»,* — звярнуў увагу беларускі лідар.

Ён занепакоены ростам напружанасці ў ваеннай сферы, якая спараджае новы віток гонкі ўзбраенняў:

*«Больш за траціну дзяржаў свету ўцягнутыя ва ўзброеныя канфлікты непасрэдна ці ўскосна. Задумваючыся над гэтым, разумееш, што наша планета паступова, але ўпэўнена скочваецца да бездані. Здаецца, што дастаткова запаліць простую запалку — і планета выбухне. І самае жудаснае, што міжнародна-прававыя і шматбаковыя палітычныя інструменты ўрэгулявання, якімі мы так ганарыліся ў перыяд «халоднай вайны», фактычна сталі анахранізмам і нікім не ўлічваюцца. Сусветныя кіруючыя эліты выпрацаваць новыя, на жаль, аказаліся не ў стане».*

Прэзідэнт адзначыў, што разумныя палітыкі на ўвесь голас кажуць аб вострым дэфіцыце паўнавартаснага дыялогу ў міжнародных адносінах. Але іх не чуюць. У гэтых умовах гандлёвыя канфлікты перацякаюць у палітычную і ваенную плоскасці, становяцца фактарам развіцця ўнутранай дэстабілізацыі асобных дзяржаў: ЗША ўступілі ў перыяд пастаяннай пратэстнай турбулентнасці, у Кітаі ўспыхнуў Ганконг, побач Тайвань стаў актыўна пераўзбройвацца, абвастрыліся супярэчнасці ў рэгіёне Паўднёва-Кітайскага мора, дзе сканцэнтраваны велізарныя запасы нафты і газу.

*«Палыхнула на індыйска-кітайскай мяжы. Каб абараніць сябе, Кітай вымушаны актывізаваць ваеннае будаўніцтва. Заіскрыла на мяжы паміж Індыяй і Пакістанам — краінамі з ядзернай зброяй. Палаючыя ачагі нестабільнасці мы зноў назіраем у Паўночнай Афрыцы, на Блізкім Усходзе. Нагнятаюцца страсці ў дачыненні да Ірана, Венесуэлы, Сірыі, іншых краін, якія дазваляюць сабе незалежную свабодалюбівую палітыку»,* — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены, што і на постсавецкай прасторы дзесяцігоддзямі не вырашаецца маса застарэлых канфліктаў: Прыднястроўе, каўказскі клубок супярэчнасцяў, армяна-азербайджанскі канфлікт. Да іх дадалася Украіна.

*«І вось на гэтым геапалітычным разломе сёння знаходзіцца Беларусь — адзінае спакойнае звяно ў цэнтры Еўразіі, якое жыве сваім розумам. Таму мы сёння на разрыў!»* — падкрэсліў Прэзідэнт.

## «НАШ АДКАЗ УСІМ ВЯДОМЫ»

*«І Расія баіцца нас страціць — бо акрамя нас у яе не засталося па-сапраўднаму блізкіх саюзнікаў. І Захад апошнім часам стаў праяўляць да нас усё больш прадметную цікавасць. Ды і Кітай сур'ёзна разлічвае на нас. Наш адказ усім вядомы: Беларусь не сябруе з кімсьці супраць кагосьці»,* — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што наша краіна выступае за шматвектарнасць, паслядоўную і прадказальную знешнюю палітыку. Пры гэтым Расія заўсёды «была, ёсць і будзе нашым найбліжэйшым саюзнікам, хто б ні быў ва ўладзе ў Беларусі ці Расіі», пацвердзіў Лукашэнка.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

20150

# «Мы сёння моцна трымаем Будучыню незалежнай

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

*«Гэта непераадольны фактар. Гэта глыбока ўнутры нашых народаў, нягледзячы на тое, што брацкія адносіны з намі памяняла на «партнёрскія». А дарэмна»,* — дадаў Прэзідэнт Беларусі, кажучы пра Расію.

Прэзідэнт запэўніў, што стратэгічнае партнёрства мы будзем будаваць з нашымі суседзямі, і з Кітаем, і з Захадам, і з ЗША, а таксама краінамі далёкай дугі.

*«Мы і далей будзем вырашаць міжнародныя праблемы выключна мірным шляхам і, калі папросяць, гатовыя працягнуць руку дапамогі іншым дзяржавам. Мы нікому ні на якія праблемы не навязваліся і навязвацца не збіраемся»,* — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што за краінай замацавалася званне донара бяспекі для еўрапейскага дома, да нас праяўляюць вялікі інтарэс у міжнароднай супольнасці, з намі хочуць мець справу самыя адказныя сусветныя гульцы.

## «МЫ ЗРАБІЛІ ПРАВІЛЬНА»

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што самым складаным выклікам для міжнародных супольнасцей стала эпідэмія невядомага віруса сусветнага маштабу.

*«Яна сур'ёзна праверыла на трываласць і наша грамадства,* — сказаў ён. — *Асноўная высновa: мы вытрымалі гэты экзамен і справіліся з гэтай бядой! Хто не аслеп, гэта бачыць!»*

Аляксандр Лукашэнка спыніўся на тым, як усё развівалася ў нашай краіне падчас пандэміі каранавіруса. Сусветны вопыт барацьбы з атыповай пнеўманіяй SARS у 2003 годзе, свіным грыпам у 2009-м, ліхаманкай Эбола ў 2014-м і шэрагам больш дробных інфекцый дазволіў увайсці ў новую пандэмію больш-менш падрыхтаванымі, лічыць ён.

*«Не апошнюю ролю выканалі ўдумлівы падыход да развіцця аховы здароўя і рэалізацыя шэрагу буйных праграм мадэрнізацыі,* — адзначыў ён. — *Нашымі плюсамі сталі захаваныя інфекцыйныя бальніцы, санітарныя службы, дастатковы ложкавы фонд, забяспечанасць дыягнастычным і лячэбным абсталяваннем».*

Галоўнымі мінусамі і небяспекай Прэзідэнт назваў невядомасць новага віруса, масавы характар яго распаўсюджвання і адсутнасць адзіных апрабаваных методык лячэння.

*«Але на другой шалі вагаў, якая ў выніку пераважыла, у нас былі беларуская навука, самаадданасць урачоў і самае галоўнае — годныя паводзіны грамадзян, асабліва старых,* — заўважыў беларускі лідар. — *У нашых шпіталях не «сартавалі» хворых, як на фронце: «маладзейшы, мацнейшы — будзе жыць, будзем лячыць, ратуем. А гэта стары, ён і так адыдзе...»*

Па словах кіраўніка дзяржавы, на кожным этапе барацьбы з гэтай бядой былі прынятыя адэкватныя меры.

*«Гэта тое, што цяпер называюць асаблівым шляхам Беларусі. І сёння ўсе краіны прызнаюць, што мы зрабілі правільна,* — сказаў Прэзідэнт. — *Але які ціск быў у пачатку! Шаблонныя для ўсіх краін рэкамендацыі СААЗ — неадкладны каранцін, каменданцкая гадзіна, закрыццё межаў, спыненне прадпрыемстваў. Як вы разумееце сёння — на гэта я пайсці не мог».*

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што кожны дзень ён вымушаны быў тлумачыць свае крокі, спрабаваў дастукацца да кожнага беларуса, даваў зразумець: спыненне, ізаляцыя — пагроза для нацыі і дзяржавы.

*«Быў абраны іншы шлях — шлях цяжкай ачаговай барацьбы з інфекцыяй. Мы зрабілі ўпор на прэвентыўнае выяўленне асоб з каранавірусам і іх кантактаў шляхам лабараторнага тэсціравання. У самыя кароткія тэрміны былі распрацаваны падрабязныя планы і праведзена перапрафіляванне наяўнага ложкавага фонду. Паралельна былі арганізаваны санітарны кантроль на ўсіх межах, наладжаны рэгістрацыя і наступнае назіранне грамадзян, якія прыбылі з неспрыяльных рэгіёнаў. Пры найменшым падазрэнні ўсіх ізалявалі на 14 дзён пад роспіс»,* — пералічыў захады дзяржавы кіраўнік.




Фота БелТА.

Ён дадаў, што ў кругласутачным рэжыме праводзілася эпідрасследаванне па кожным выпадку захворвання на каранавірус.

Аператыўна ўкаранілі правілы сацыяльнага дыстанцыявання і дадатковую дэзынфекцыю ў грамадскім транспарце, на вакзалах, у гасцініцах і іншых месцах збору людзей. Штодня з улікам абмену з калегамі з іншых краін самай свежай інфармацыяй і ўласнага досведу абнаўлялі пратаколы лячэння пацыентаў.

*«Мінздароўя працавала як аператыўны штаб. Урачы круціліся як маглі. Быў узмоцнены рэжым назірання за станам здароўя школьнікаў, студэнтаў і дзяцей, якія наведваюць дзіцячыя сады. Падаўжаліся школьныя канікулы. Выкарыстоўваліся тэхналогіі дыстанцыйнага навучання, якое сталі аператыўна ўкараняць. На працягу аднаго-двух тыдняў мабілізавалі сотні прамысловых прадпрыемстваў на выпуск медыцынскіх масак, рэспіратараў, халатаў, антысептыкаў, лінейкі лекаў»,* — працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

Ён зноў падзякаваў кіраўніцтву КНР за дапамогу ў гэтай сітуацыі. У выніку ўсяго зробленага нам не прыйшлося прыстасоўваць спартыўныя збудаванні і гандлёвыя цэнтры для аказання медыцынскай дапамогі.

*«Мы задзейнічалі толькі палову ложкавага фонду, які быў зарэзерваваны,* — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — *У нас на ШВЛ знаходзілася хворых не больш за 10—11 працэнтаў ад наяўнасці гэтых апаратаў штучнай вентыляцыі лёгкіх».*

Прэзідэнт прызнаў, што не ўсё было гладка. Па яго словах, у такім напружанні немагчыма было абысціся без лакальных памылак і перагібаў.

*«Многія людзі былі незадаволеныя. Але галоўнае — адэкватная рэакцыя з боку ўлады на крытыку,* — лічыць Прэзідэнт. — *Мы імгненна стараліся выправіць недахопы. Уся вертыкаль улады працавала зладжана. Прэзідэнт штодня раніцай і ўвечары прымаў справаздачы штабоў і каардынаваў усю работу ўрада і рэгіёнаў».*

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кіраўнікам рэгіёнаў і дадаў, што патрабаванні да кадраў былі арганізаваны па стандартах ваеннага часу, але без хаосу і панікі.

*«Кожны ведаў, што яму рабіць, дзе рабіць і ў які час. Дапамога Віцебску, потым мінчанам, «кавідныя» надбаўкі медыцынскім і сацыяльным работнікам — яскравыя таму прыклады,* — сказаў ён. — *Асобная падзяка нашым людзям. Не паддаліся масавай паніцы, абаранілі пажылых грамадзян, праявілі велізарную самаадданасць у дапамозе медыкам — бясплатныя абеды, спонсарскія ахвяраванні, валанцёрства. Даказалі чалавечнасць беларусаў і адзінства грамадства перад тварам бяды».*

Асабліва падзякаваў Прэзідэнт дэпутатам парламента.

*«Вы выратавалі асноўную масу нашых старых,* — звярнуўся ён да народных абраннікаў. — *У нас 150 з лішнім дамоў састарэлых, і гэта была зона адказнасці ваша... Сённяшні склад парламента будзе ганарыцца сваім подзвігам».*

## «ТРЭБА ДАВЯРАЦЬ УРАЧАМ, СПЕЦЫЯЛІСТАМ І ЎЛАДЗЕ»

Па словах кіраўніка дзяржавы, пасля пандэміі прыйшоў час атрымаць урокі і зрабіць высновы. Першае: ніколі нельга верыць чуткам і паддавацца паніцы. Неабходна спакойна, разумна рэагаваць і думаць сваёй галавой. І не варта слепа капіяваць чужыя рэцэпты.

*«А яшчэ, калі хочаце, трэба давяраць. Давяраць урачам, спецыялістам і — прабачце мне за гэты выраз — давяраць уладзе, калі вы яе абралі»,* — дадаў ён.

Ён выказаў перакананне, што ў краіне неабходна больш актыўна праектаваць і будаваць новыя аб'екты аховы здароўя і далей развіваць сваю вытворчасць лекаў. Пандэмія прадэманстравала, наколькі гэта перспектыўны кірунак. На коне — мільярды долараў.

*«А ўспомніце, літаральна паўтары пяцігодкі таму мы стваралі ўсяго 13 працэнтаў уласных лекаў. І тады Прэзідэнт паставіў жорсткую задачу: 50 працэнтаў, не меней. Сёння маем 60!»,* — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Жыццё паказала правільнасць стварэння сістэмы міжраённых медыцынскіх цэнтраў (так званых апорных клінік — яны будуць развівацца), а таксама перааснашчэння службаў хуткай і неадкладнай дапамогі. Гэтую работу Аляксандр Лукашэнка даручыў завяршыць максімальна хутка. На гэта будуць накіраваныя ўсе сродкі, выдзеленыя міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. У тым ліку працягнецца абсталяванне рэгіянальных клінік камп'ютарнымі тамографамі — у неабходнасці гэтага ўжо ўпэўніліся ўсе.

Па словах беларускага лідара, стварэнне кантакт-груп, аснашчаных транспартам і абсталяваннем, істотна павысіла магчымасці першаснага звяна. І цяпер трэба знайсці месца падобным мабільным групам у сістэме аказання медыцынскай дапамогі.

*«Гэта ўжо навацыя, якой у свеце не было. Людзі, якія лячыліся амбулаторна, знаходзіліся пад распіскай, ізаляваныя, пастаянна былі ў полі зроку кантакт-груп. Толькі ў Мінску на піку нам давялося трымаць 700 экіпажаў зноў створаных, якія кантралявалі гэтых людзей на амбулаторным лячэнні. І кантралявалі вельмі эфектыўна»,* — расказаў ён.

## «КРЫЗІС — ЧАС ВЯЛІКІХ МАГЧЫМАСЦЯЎ»

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння трэба як мага хутчэй ліквідаваць уплыў пандэміі на эканоміку.

*«Вы бачыце, якая сітуацыя ў свеце: закрыццё межаў, масавае банкруцтва, дзікае беспрацоўе. Інтэграцыйныя структуры і блокі, па сутнасці, паралізаваныя. Літаральна за два-тры месяцы разбураныя самыя ўстойлівыя сувязі. Адбываецца тое, аб чым не маглі падумаць нават перакананыя песімісты. Практычна ўсе эксперты прагназуюць працяглую рэцэсію і абвал»,* — заявіў ён.

На яго думку, ліберальная эканамічная мадэль ужо дакладна з такімі выклікамі не справіцца. Аляксандр Лукашэнка зноў паўтарыў, што нават у гэтай няпростай сітуацыі Беларусь не закрыла прадпрыемствы, а накіравала з бюджэту дадаткова паўмільярда рублёў тым, хто асабліва меў патрэбу ў падтрымцы дзяржавы.

*«І гэта ва ўмовах, калі з-за нафтавых разборак з Расіяй бюджэт недаатрымаў паўтара мільярда рублёў,* — адзначыў кіраўнік

# у руках сваю будучыню. Беларусі»

краіны. — *Мэта адна — выратаваць краіну і захаваць рабочыя месцы, не страціўшы даходы. Скажу шчыра: не да раскошы*».

Лідар дзяржавы дадаў, што «крызіс — гэта не толькі бяда, але і час вялікіх магчымасцяў».

«*У нас ёсць шанцы прыбавіць — эпідэмія агаліла рынкі, і з'явілася перспектыва па многіх таварах заняць новыя нішы*, — канстатаваў Прэзідэнт. — *Таму, чаго б гэта ні каштавала, ураду і Нацыянальнаму банку неабходна ўсе рэсурсы і рэзервы накіраваць у рэальны сектар эканомікі*».

## «ТОЛЬКІ САМІ МОЖАМ СЯБЕ ВЫРАТАВАЦЬ!»

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што цяпер нельга нічога разбураць, трэба абараняць людзей і прасоўваць эканоміку наперад хоць бы на тры-чатыры працэнты штогод, бо гэта сярэднесусветныя тэмпы росту. Прэзідэнт пералічыў шэраг задач, выкананне якіх дапаможа ў наступнай пяцігодцы дасягнуць гэтага ўзроўню.

«*Вынікі бягучага перыяду паказалі, што высокая знешняя залежнасць ад аднойдзвюх краін ставіць нас у слабае становішча. З-за гандлёвых войнаў, несправядлівых цэн, дарагіх крэдытаў краіна страціла дзевяць з паловай мільярдаў долараў эканамічнага росту за пяць гадоў. А гэта — пенсіі, стыпендыі, зарплаты бюджэтнікаў, падтрымка сем'яў*», — нагадаў кіраўнік краіны і сказаў, што з гэтага зрабілі высновы.

Каб да 2025 года ўплыў пералічаных фактараў быў мінімальны, уводзяць новую інфраструктуру паставак нафты і газу, дыверсіфікуюць крэдытны партфель і таварныя патокі, асвойваюць новыя экспартныя рынкі.

«*Самая магутная і бяспечная крыніца росту эканомікі — гэта інвестыцыі. Шмат сёння кажуць, у тым ліку нашы «альтэрнатыўшчыкі», што да нас хлынуць інвестары звонку. І калі аддадзім ім свае прадпрыемствы, то Беларусьператворыцца ў райскі куток*», — дадаў лідар краіны і прапанаваў паглядзець на гэта з рэальных пазіцый.

Прэзідэнт прывёў лічбы падзення сусветных эканомік. ВУП ЗША ў другім квартале гэтага года, нягледзячы на велізарныя пакеты стымулаў, упаў на рэкордныя 33 працэнты. ВУП Германіі скараціўся на 12 працэнтаў і па сваім памеры вярнуўся на ўзровень 2011 года. Іспанія вярнулася ў 2002 год (мінус 22 працэнты), а Італія адкінутая наогул у пачатак 90-х гадоў (мінус 17 працэнтаў).

«*Ну і куды, як вы думаеце, пойдуць у гэтых умовах амерыканскія, нямецкія, ды і расійскія інвестыцыі? Вядома, на аднаўленне сваіх краін. Не будзьце наіўныя — яны застануцца дома. Думаць, што яны прыбягуць у Беларусь і будуць нас падымаць — гэта верх глупства і фактычна шлях да самазнішчэння. Не трэба ўводзіць народ у зман, калі ў свеце пануе эканамічны нацыяналізм*», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што «толькі мы самі можам сябе выратаваць!» — наш валавы прадукт у першым паўгоддзі скараціўся ўсяго на 1,7 працэнта. Ужо ў чэрвені эканоміка прыбавіла, прырасла на адну дзясятую, а экспарт тавараў — адразу на 1,5 пункта.

«*Пералом негатыўнай дынамікі намеціўся. Трэба прыбаўляць! Адбылося гэта таму, што мы, не закрыўшыся, стваралі тавар*», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Нягледзячы на сітуацыю, інвестыцыі працягваюць заставацца прыярытэтам айчыннай эканомікі. З 2016 года ў Беларусі створана трыста тысяч новых рабочых месцаў. Нават ва ўмовах пандэміі не дапушчана масавага беспрацоўя. Колькасць вакансій стабільна перавышае попыт на іх.

«*Калі 10—15 гадоў таму мы казалі пра інвестыцыі дзеля інвестыцый, каб стварыць рабочыя месцы, то сёння нам такія інвестыцыі не патрэбныя. Ствараць будзем тыя вытворчасці, якія выпускаюць канкурэнтаздольную прадукцыю і прыносяць прыбытак. Але працаваць яны будуць у роўных умовах з айчыннымі прадпрыемствамі*», — паставіў кропку ў пытанні Аляксандр Лукашэнка.

## КОЖНАЙ ВОБЛАСЦІ — БУЙНЫ ПРАЕКТ

Фарміруючы новую пяцігодку, павінны ўзяць добры прыклад з савецкіх часоў, вопыт Кітая, Японіі, калі быў цвёрды план: выразна распісаныя інвестыцыйныя аб'екты, аб'ёмы фінансавання, іх крыніцы плюс дысцыпліна. Толькі так можна вырашыць праблему раўнамернага развіцця рэгіёнаў і размеркавання прадукцыйных сіл.

У кожнай вобласці неабходна рэалізаваць па адным буйным праекце, у Мінску — два.

«*Па прыкладзе «Гродна Азот» яны павінны быць дэталёва пралічаны і забяспечаны крыніцамі фінансавання. Плюс у кожным раёне трэба пабудаваць па адным-два «сярэднія» аб'екты ў вытворчай сферы. Такія прыклады ёсць: Петрыкаў, Любань, Смаргонь, Мёры*», — пералічыў кіраўнік краіны.

Пры гэтым не ўсюды іх прыйдзецца будаваць з нуля — практычна ва ўсіх раёнах краіны ёсць свабодныя вытворчыя пляцоўкі.

## КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ ЖЫЦЦЯ ДЛЯ ГЛЫБІНКІ

За наступную пяцігодку, па словах Прэзідэнта, цалкам завершыцца мадэрнізацыя вёскі.

«*Неперспектыўных вёсак у нашай краіне быць не павінна! Гэта задача не толькі для дзяржавы. Мы павінны даць магчымасць кожнаму беларусу пабудаваць домік у вёсцы і замацавацца на зямлі*, — сказаў кіраўнік краіны. — *Я шчыра веру, што закінутыя куткі пачнуць адраджацца і гэтая ініцыятыва знойдзе шырокі водгук у нашых грамадзян. І не толькі ў тых, хто калісьці жыў на вёсцы, але і ў гараджан, якія не ведалі вясковага жыцця*».

За тры гады для малой радзімы нямала зрабілі. І як запэўніў Прэзідэнт, распачатую работу абавязкова завершым — аграгарадкі давядзём да ўзорнага парадку, вёскі ўжо ў нядрэнным стане.

«*Ужо да канца гэтага года прымем рашэнне: кінутыя хаты і сядзібы будзем прадаваць людзям па простых, зразумелых правілах і прымальных цэнах. Дзесьці — проста за сімвалічную плату. А задача дзяржавы — стварыць інфраструктуру. Людзі ў глыбінцы павінны мець камфортныя ўмовы для жыцця, не горшыя, чым у гарадах. Вось і ўся рэгіянальная палітыка!*» — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## БІЗНЕС — ФАКТАР РОСТУ

Бізнес, які гатовы сумленна працаваць на карысць краіны і народа, у Беларусі заўсёды падтрымлівалі і будуць падтрымліваць.

«*Я неяк аналізаваў і заўважыў адну асаблівасць. Якасць нашага бізнесу нашмат вышэйшая, чым у іншых постсавецкіх краінах. Сапраўдныя беларускія бізнесмены пачыналі з нуля, а не з прыватызацыі. І дасягнулі поспеху толькі сваімі мазгамі, воляй і каласальнай працай. Такіх людзей я заўсёды паважаў і паважаю. Прыватны бізнес вырас, памацнеў і застанецца для Беларусі фактарам росту*», — падкрэсліў беларускі лідар.

Работы ў краіне больш чым дастаткова. Структура беларускай эканомікі аб'ядноўвае мноства галін. З аднаго боку, нам дасталося шмат фінішных вытворчасцяў, залежных ад імпарту сыравіны і камплектуючых, але з іншага — гэта велізарныя магчымасці для развіцця.

«*Наша прамысловасць імпартуе камплектуючых больш чым на чатыры мільярды долараў у год. Ніша для імпартазамяшчэння проста каласальная. Трэба ствараць невялікія кампаніі, вырабляць гэтыя камплектуючыя на чатыры мільярды долараў. У свеце сумесная работа ці кааперацыя з прамысловымі гігантамі — мяжа мар любога малога ці сярэдняга прадпрыемства. Усе змагаюцца за гарантаваныя заказы і магчымасць трапіць на канвеер*», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Таму, упэўнены ён, няма чаго наракаць на малую ёмістасць унутранага рынку. Лакалізацыя вытворчасці кампанентаў толькі на такіх заводах, як «БелДжы», МТЗ або БелАЗ, ужо дасць велізарны эфект для бізнесу.

А ёсць яшчэ патэнцыйныя кластары ў дрэваапрацоўцы, дзе не хапае мэблевых і папяровых заводаў, у лёгкай прамысловасці (скура і лён), па выпуску інавацыйных будаўнічых матэрыялаў і ў фармацэўтыцы.

«*Трэба абараняць свой рынак. Каранавірус ясна паказаў сапраўдную цану гандлёвых правілаў і абавязацельстваў. Усе на іх наплявалі і аж да адкрытых канфрантацый абараняюць сваіх вытворцаў. Не пускаюць у дзяржзакупкі, на бюджэтныя будоўлі. Гэта значыць, сёння ўсе краіны гэтым працэсам жорстка кіруюць. Мы таксама прымем прынцыповыя рашэнні ў найбліжэйшы час. Але ніякая абарона не дапаможа няякасным таварам*», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуўся да ўсіх кіраўнікоў і спецыялістаў: пытанні якасці прадукцыі, яе адпаведнасці міжнародным стандартам з'яўляюцца прыярытэтам. Па многіх пазіцыях знак «Зроблена ў Беларусі» ўжо працуе як найлепшая рэклама, асабліва ў дачыненні да прадуктаў харчавання.

## «ГЭТЫ ГОД НЕ МАЕМ ПРАВА СТРАЦІЦЬ»

Кіраўнік дзяржавы спыніўся на папроках на яго адрас за залішнюю ўвагу да вёскі.

«*Чамусьці некаторыя думаюць, што поўная харчовая бяспека і штогадовы экспарт прадуктаў харчавання на шэсць мільярдаў долараў упалі нам з неба. Попыт на харчаванне ў свеце расце. ААН прагназуе: амаль мільярд чалавек будзе ў найбліжэйшы час галадаць. Сялянская праца будзе заўсёды запатрабаваная*», — адказаў ён.

Таму далейшае развіццё атрымае і сельгасвытворчасць. Сёлета чакаецца небывалы ўраджай. Калі яго якасна ўбраць, эканоміку вёскі ўдасца сур'ёзна папраўляць, бо попыт па ўсіх культурах будзе высокі.

«*Чаго б нам ні каштавала, трэба актывізавацца, нягледзячы ні на якія выбары. Выбары скончацца, а есці трэба будзе і пасля 9 жніўня. І гэты год мы не маем права страціць. Усяляк трэба дапамагчы сялянам, мы будзем выкарыстоўваць розныя варыянты, але ніколі не пойдзем на прыватызацыю зямель сельгаспрызначэння*», — абазначыў межы Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, у прыватызацыі няма неабходнасці. Любому ахвотнаму прапануецца арэнда, а рэзаць зямлю на кавалкі і раздаваць ніхто не дасць. Прэзідэнт перасцярог ад паўтору памылак Украіны з яе зямельным законам, спараджэння нелегальнага рынку зямлі і гадавання крыміналу.



Фота БелТА.

# «Мы сёння моцна трымаем Будучыню незалежнай

## НОВЫЯ ПУНКТЫ РОСТУ — «ЛІЧБА», МІРНЫ АТАМ, БІЯТЭХНАЛОГІІ І КОСМАС

Стагоддзямі для Беларусі сельская гаспадарка з'яўлялася традыцыйнай сферай эканомікі — можна сказаць, візітнай карткай нашай краіны. А ў апошнія гады ў свеце нас усё часцей называюць ІТ-краінай.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб камфортных умовах, якія створаны ў Беларусі для гэтага сектара эканомікі. Дасягнуты поспех ён назваў заслугай тых, хто ініцыяваў і падрыхтаваў адпаведны Дэкрэт у 2017 годзе.

За мінулы год экспарт ІТ-сферы склаў 2,5 мільярда долараў. За адзін год новых рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій з'явілася больш, чым за ўсе папярэднія 12 гадоў яго існавання. Ва ўмовах пандэміі галіна не толькі не страціла, але і працягнула расці, прычым вельмі імкліва.

*«А рашэнне па Парку прымалася не толькі і не столькі дзеля саміх айцішнікаў. Бо што такое ІТ-парк? Гэта ж мільярды валюты для краіны. Яны зарабляюць іх за мяжой, а пакідаюць тут. І гэта вялікі ўклад у нашу эканоміку. Магутны ІТ-сектар — сведчанне ўзроўню развіцця нацыі. За ім будучыня. Але «лічбу» трэба ўкараняць хутчэй. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі — гэта штучны інтэлект, разумны горад, паслугі, грамадская бяспека, уласныя аплатныя сістэмы, якія не залежаць ад транснацыянальных»*, — мяркуе беларускі лідар.

На яго думку, варта дамовіцца аб прамым стратэгічным супрацоўніцтве з лідарамі лічбавізацыі, якімі ў свеце вызначаныя ЗША і Кітай.

Яшчэ адна новая галіна — атамная энергетыка. Значэнне Беларускай АЭС для забеспячэння энергетычнай бяспекі і ў цэлым эканомікі нашай краіны Аляксандр Лукашэнка назваў велізарным: з ёй звязана развіццё адукацыі, тэхналогій.

*«І не трэба нам указваць і тыкаць на пытанні бяспекі. Мы — «чарнобыльская» рэспубліка, многае перажылі. І самі ведаем цану наступстваў. Толькі на рэабілітацыю забруджаных тэрыторый выдаткавана 19 мільярдаў долараў. Таму ўваходны кантроль пры будаўніцтве станцыі быў як у ваенны час»*, — паведаміў Прэзідэнт. Пры гэтым перавагі, якія набудзе краіна, дапамогуць зрабіць прарыў у будучыню (высокія тэхналогіі, танная электраэнергія, электрамабілі).

*«Або суперсучасная вытворчасць амінакіслот нашай Біятэхналагічнай карпарацыі, якую мы будуем сумесна з Кітаем у Мінскай вобласці. Дзякуючы такім вытворчасцям «зялёная» эканоміка з моднага трэнду стане нашай рэальнасцю»*, — нагадаў лідар дзяржавы.

За апошнія 5-6 гадоў збор асобных відаў другасных рэсурсаў у Беларусі вырас у два з паловай разы.

*«А гэта — бясплатная сыравіна, якая валяецца пад нагамі. Мы прынялі рашэнне аб адмове з 2021 года ад аднаразовага пластыкавага посуду і тары. Іх заменіць экалагічная ўпакоўка. Падтрымаю і іншыя прапановы ў гэтай галіне»*, — звярнуўся да аўдыторыі Аляксандр Лукашэнка.

Апошнім часам менш кажуць аб космасе, аднак невялікая, небагатая, але таленавітая Беларусь — член клуба касмічных дзяржаў, нагадаў Прэзідэнт.

## АКЦЭНТ ПЯЦІГОДКІ — НА МЯСЦОВЫЯ ДАРОГІ

Надрэнныя вынікі паказвае будаўнічы комплекс, які адным з нямногіх здолеў даваць у пандэмію і падцягнуць увесь ВУП (рост за паўгоддзе на пяць з паловай працэнтаў), канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

*«А жылля з дзяржпадтрымкай пабудавалі і ўвогуле больш на сямнаццаць працэнтаў. Трэба развіваць гэты кірунак і больш актыўна яго фінансаваць*, — упэўнены ён. — *Асабліва глядзіце па дарогах і мастах, дзе мы таксама нядрэнна разгарнуліся. Бяспечныя і якасныя дарогі даўно сталі брэндам Беларусі. Трэба гэта шанаваць».*

Прэзідэнт ужо адзначаў, што самая цяжкая работа — звязаць магістралямі першай катэгорыі сталіцу з усімі абласнымі цэнтрамі — выкананая. На падыходзе рэканструкцыя трасы М1 Брэст — Масква.

*«Тым не менш асноўны акцэнт пяцігодкі — на мясцовыя дарогі*, — падкрэсліў ён. — *Ад райцэнтраў да аграгарадкоў і сельскіх пунктаў неабходна абнавіць не менш за сем тысяч кіламетраў. Мы гэту работу распачалі. Гэтак жа, як 32 масты, якія мы запланавалі цалкам перабудаваць, па якіх ужо прыняты рашэнні і яны прафінансаваныя».*

Знакавымі аб'ектамі стануць хуткасная электрычка ў аэрапорт (праз Парк «Вялікі камень») і трасы да гарадоў-спадарожнікаў, што надасць ім зусім іншае развіццё, паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу ўрада на тое, што так і не прыняты рашэнні па дарожным зборы, які да гэтага часу не адвязалі ад тэхагляду, і загадаў хутчэй закончыць гэту работу.

Спыніўшыся на прынцыповых пытаннях будучай эканамічнай палітыкі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што канчатковыя контуры развіцця Беларусі яе народ вызначыць сам на Усебеларускім народным сходзе, калі будзе абмяркоўваць праграму на наступную пяцігодку.

Пры гэтым дакумент павінен быць максімальна просты, даступны і зразумелы, мяркуе беларускі лідар: *«Кожны грамадзянін павінен убачыць, якія змены і вынікі будуць у краіне».*

## «ПЕРАМЕНЫ ПАВІННЫ ПРЫНОСІЦЬ КАРЫСЦЬ»

Тэма перамен у перадвыбарчы перыяд на слыху. Але заклік ажыццявіць «перамены» праз вяртанне ў 90-я, вяртанне Канстытуцыі 1994 года Прэзідэнт назваў «падарункам крыміналу і крымінальнаму бізнесу».

*«Вярнуўшы Канстытуцыю 94-га года, мы адродзім безладдзе, абязлічым адказнасць кадраў. Тым, хто стаіць за гэтымі заявамі, патрэбна блытаніна ў краіне, каб «распіляваць», парэзаць дзяржуласнасць, дзяржаўныя прадпрыемствы і «прыхватызаваць», як раней казалі, іх! Увесці прыватную ўласнасць на зямлю і пазбавіць народ таго, на чым ён стаяў і стаіць заўсёды, і стаяць будзе»*, — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Ён упэўнены: ажыццяўляючы «перамены», трэба ісці ад людзей і станка. Перамены павінны прыносіць карысць краіне, умацоўваючы яе, а не руйнуючы. Таму беларускі шлях рэформаў — гэта цярплівае, удумлівае ўдасканаленне той вытворчасці, якая створана ў нашай краіне і заснавана на ўласных сыравінных базе, навуцы і кампетэнцыі. Трэба займацца тым, што ты ўмееш рабіць перш за ўсё, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

*«Рэформы — гэта не кампанія, гэта працэс, часам цяжкі і балючы. Нездарма ў народзе кажуць: «Крый божа жыць у перыяд рэформаў і перамен». Але калі не ажыццяўляць перамены, яны пройдуць без нас і міма нас. Таму, трымаючы руку на пульсе, трэба своечасова заўважыць імкненне грамадства да рэальных перамен і адрэагаваць. Шлях «разбурыць ушчэнт, а затым...» — не наш шлях. Ліміты рэвалюцый і разбурэнняў беларускі народ вычарпаў у мінулым стагоддзі. Ніякага перадзелу ўласнасці не будзе! Чым ён канчаецца, мы бачылі на прыкладзе краін, якія спрабавалі пайсці па гэтым шляху»*, — заявіў Прэзідэнт.

Тых, хто крытыкуе кіраўніцтва Беларусі за яго эканамічную палітыку, Лукашэнка запрасіў да супрацоўніцтва: *«Калі нашы кандыдаты ці вечныя эксперты-эканамісты (якія нідзе не працавалі, акрамя інтэрнэт-форумаў і тэлеграм-каналаў) ведаюць рэцэпт, як без сацыяльных выбухаў, па-асабліваму рэфармаваць асобныя дзяржпрадпрыемствы, я гатовы іх не толькі выслухаць. Больш за тое, абяцаю любому даць магчымасць паказаць сябе на практыцы. Прадпрыемстваў больш чым дастаткова, моцныя, добрыя: БАТЭ, «Магілёўхімвалакно», «Белшына», «Камволь» — выбірайце, ідзіце, пакажыце сябе, як вы ўмееце гэта рабіць».*

Пра небяспеку абвальнай прыватызацыі памятае старэйшае пакаленне. *«Тым, каму ідэя «прыхватызацыі» зноў можа здацца прывабнай, нагадаю, як гэта было ў 90-я. Дырэктары і іншыя набліжаныя за бесцань скупілі акцыі сваіх супрацоўнікаў. І ў выніку прадпрыемства аказвалася ў руках незразумелых дзялкоў, якія часта сядзяць за мяжой і не маюць ніякіх абавязацельстваў. Нават пытанні па развіцці прадпрыемстваў не было каму задаць»*, — у прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў прадпрыемствы «Камунарка» і «Спартак».



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ГЕНЕТЫЧНЫ КОД БЕЛАРУСАЎ

Дзяржава заўсёды працягне руку любому, хто рэальна мае патрэбу ў дапамозе. Па словах Прэзідэнта, гэта асноўны прынцып нашай сацыяльнай палітыкі.

*«І для нас гэта не папулізм, не кан'юнктура, не даніна модзе, а галоўны прынцып нашай палітыкі. Добрасардэчнасць, спачуванне, справядлівасць — гэта, калі хочаце, генетычны код беларусаў. У гэтым уся наша душа. Наша вера і нашы традыцыі»*, — працягнуў ён, таму эканоміка будзе падпарадкавана адной мэце — клопату пра людзей.

Рост дабрабыту і даходаў грамадзян — галоўная задача ўрада. І, як запэўніў кіраўнік краіны, працягнецца ўзважаная, спакойная работа ў гэтым кірунку.

*«Не верце тым, хто, нічога не разумеючы, абяцае вам залатыя горы. Цудаў не бывае. Усё даецца толькі сваёй працай. Асабліва ў гэтай страшнай крызіснай сітуацыі. У нас няма дзіакага сацыяльнага расслаення. А ўсё астатняе залежыць ад работы эканомікі. Ніякіх сакрэтаў тут няма: будзем больш вырабляць і прадаваць на экспарт запатрабаваную прадукцыю — вырасце і дабрабыт»*, — дадаў кіраўнік краіны.

Пад гэтую мэту звярстаныя і планы, і праграмы, і разлікі. *«У будучай пяцігодцы сярэдняя заработная плата ў Беларусі вырасце не ў пяць, не ў дзесяць, а ў два разы»*, — паабяцаў Прэзідэнт.

Сярэдні памер пенсіі па ўзросце будзе падтрымлівацца на ўзроўні 40 працэнтаў ад сярэдняга заробку па краіне. *«Каб пенсія была вышэйшая, будзем больш актыўна ўкараняць сістэму добраахвотных пенсійных накапленняў з удзелам грамадзян і прадпрыемстваў. Фарміраваць дадатковую пенсію пад сілу ўжо шмат каму з работнікаў. Галоўнае — стварыць умовы»*, — адзначыў лідар краіны.

Па яго словах, найважнейшая задача — зрабіць так, каб рост пенсій стабільна перавышаў рост цэн.

## ДЗЯРЖАЎНЫ КАНТРОЛЬ ЦЭН І ЯГО ВАЖНАСЦЬ

У Беларусі дамагліся нізкай інфляцыі ў межах пяці працэнтаў, а многія рэфарматары зноў загаварылі аб поўнай лібералізацыі, заўважыў Прэзідэнт.

*«Але наколькі важны дзяржаўны кантроль цэн, паказалі апошнія падзеі. Не ўзялі б пад кантроль цэны, адказныя гандлёвыя работнікі набілі б тоўстыя кішэні. Мы кіравалі некалькімі дзясяткамі цэн на прадукты харчавання і ўбачылі нармальны эфект. Людзі ацанілі, таму мы павінны вызначыць пералік сацыяльна значных тавараў, якія хвалююць насельніцтва больш за ўсё. І ўсе органы ўлады разам з прафсаюзамі павінны забяспечыць кантроль за цэнамі»*, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ВЯРНУЦЬ ТРАДЫЦЫІ ШМАТДЗЕТНАСЦІ

Яшчэ адна найважнейшая тэма ў пасланні — дэмаграфія. Прэзідэнт даў адказ апанентам улады, якія паўтараюць, што беларусы выміраюць.

*«Давайце параўнаем. За трыццаць гадоў незалежнасці насельніцтва Украіны скарацілася на 20 працэнтаў (мінус 10 мільёнаў чалавек), Літвы — на 25 (мінус амаль мільён), Латвіі — амаль на 30 (мінус 800 тысяч). У нас у Беларусі — на восем працэнтаў. Наша сітуацыя абумоўлена дэмаграфічнай ямай сярэдзіны 90-х, наступствы якой будуць адчувацца яшчэ 20 гадоў»*, — сказаў Прэзідэнт.

Маладыя бацькі адкладаюць нараджэнне дзяцей, бо на першым месцы кар'ера і жыццё для сябе. Таму дзяржава робіць усё магчымае, каб вярнуць традыцыі шматдзетнасці ў грамадства, павысіць каштоўнасць сям'і з некалькімі дзецьмі.

Рэалізаваны маштабныя сацыяльныя праграмы — працягваецца праграма сямейнага капіталу (адкрыта каля 90 тысяч дэпазітаў), пашыраны кірункі датэрмінованага выкарыстання гэтага капіталу. Стратэгія працуе, бо за апошнія дзесяць гадоў падвоілася колькасць шматдзетных сем'яў (з 60 тысяч да 110 тысяч).

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

# у руках сваю будучыню. Беларусі»

## ПЯЦІГОДДЗЕ МАЛАДОЙ БЕЛАРУСІ

*«Моладзь заўсёды была і будзе заставацца прыярытэтам дзяржавы. Проста таму што яна — будучыня краіны,* — падкрэсліў Прэзідэнт. — *Таму мы традыцыйна аддаём маладому пакаленню больш, чым атрымліваем ад іх наўзамен. Гэта інвестыцыі ў будучыню. Мы захавалі даступныя базавую і вышэйшую адукацыю для ўсіх. Можа, для жыхароў сталіцы гэта і не з'яўляецца чымсьці выдатным. Але для дзяцей з глыбінкі, з сем'яў простых рабочых і сялян, настаўнікаў, урачоў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі — гэта вялікая магчымасць для першага кроку ў жыцці».*

Пакаленне беларусаў, якія нарадзіліся ў незалежнай краіне, Аляксандр Лукашэнка назваў цікавым і вельмі разнастайным.

*«І, нягледзячы на тое, што ў асяроддзі моладзі зараз, як ні ў якім іншым, распаўсюджаныя «іншыя думкі», мы ганарымся гэтым пакаленнем,* — заявіў ён. — *Ганарымся яшчэ і таму, што яно наша — мы яго выгадавалі. Ганарымся тым, што, фактычна маючы толькі 25—30-гадовы вопыт незалежнасці, выхавалі вольнадумных і неабыякавых людзей. Недзе мы за гэта і атрымалі».*

Менавіта на пачуццях справядлівасці і неабыякавасці нашых маладых людзей цяпер будуюцца сапернікамі нядобрасумленныя тэхналогіі ўцягвання моладзі ў палітычны працэс, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

*«Пры гэтым акцэнты ссоўваюцца з плоскасці рацыянальнага асэнсавання і разумення канчатковай мэты ў плоскасць эмацыянальнага ўспрымання адзінкавых падзей, малюнкаў у сацсетках, відэаролікаў у пабліках тыпу: «Не будзь рабом», «Мы народ, а не народзец», «Не дай скрасці свой голас». Лёгка запамінаецца, лёгка вымаўляецца. Пачуў — і адразу нясеш у масы, не трэба асэнсоўваць. А асэнсоўваць трэба, каб потым па сканчэнні часу не было балюча за прынятыя пад уплывам эмоцый рашэнні,* — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — *Ніхто не збіраецца красці нічые галасы, як бы нас ні папракалі ў цэнзуры. Мы самі стварылі краіну, дзе голас моладзі чутны як ніколі. У тым ліку голас групы тых жа выпускнікоў Ліцэя БДУ, якому ў свой час былі дадзены ўнікальныя прэферэнцыі з боку дзяржавы, мной былі дадзеныя, вось гэтымі самымі рукамі створаныя...»*

Прэзідэнт нагадаў пра абставіны па вышэйшым класе будынак ліцэя ў цэнтры горада, пра калектыў вядучых выкладчыкаў, пра сістэму паступлення, дзе вырашаюць не сувязі і магчымасць прывілеяванай падрыхтоўкі, а веды і стараннi абітурыента.

*«У такіх установах мы і выхавалі новае свабоднае пакаленне (якое нас зараз і папракае). Гэта падобна да адносін дзяцей і бацькоў, калі ў нейкі момант дзіця кажа, што стаміласа ад апекі і што наогул не надта ж прасіла пра яго клапаціцца,* — дадаў кіраўнік дзяржавы. — *На шчасце, амаль заўсёды прыходзіць момант, калі дзіця вяртаецца і кажа бацькам «дзякуй». Але для гэтага важна, каб, сыходзячы ў дарослае жыццё, яно не спальвала бацькоўскі дом, каб потым было куды вярнуцца і не прыйшлося плакаць на папялішчы».*

Яшчэ адзін важны аспект у маладзёжнай палітыцы дзяржавы — падтрымка маладзёжнага спорту.

*«Як бы мяне ні папракалі за адсылку да 90-х, але зараз у нашых барцоў і баксёраў няма неабходнасці далучацца да злачынных груповак, каб пракарміць сваe сем'і. А было ж так,* — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — *Яны займаюцца любімай справай, выйграюць турніры, трэніруюць падрастаючае пакаленне, маюць важкі голас у грамадстве, прычым выступаючы як на баку ўлады, так і крытыкуючы яе».*

У Беларусі створана сістэма абароны і падтрымкі маладых сем'яў. Гэта і магчымасць бясплатнага ЭКА, і сацыяльная абарона маці, і фінансавая, і матэрыяльная падтрымка, асабліва шматдзетных і маламаёмасных сем'яў. Гэта і льготнае крэдытаванне з боку банкаўскай сістэмы для пабудовы ўласнага жылля, і выдзяленне арэнднага жылля маладым спецыялістам, і многае іншае.

*«Але моладзь розная,* — працягнуў думку Аляксандр Лукашэнка. — *Для кагосьці словы «будаўнічы студатрад» з'яўляюцца чымсьці далёкім і архаічным, але для многіх рабят — гэта рэальная магчымасць дадаткова заробку. Сам праз гэта прайшоў. Для адных размеркаванне пасля ВНУ — абавязковая адпрацоўка, для іншых — магчымасць гарантаванага дзяржавай працаўладкавання. Для кагосьці валанцёрства — гэта актыўнае інфармаванне ў сацсетках і самарэалізацыя, нават самапіяр, для іншых — дапамога ветэранам і інвалідам у складзе атрадаў БРСМ».*

Для дзяржавы ўсе маладыя людзі — каштоўнасць і стратэгічны запас, падкрэсліў лідар.

*«І тыя, хто пад дзеяннем эмоцый і, можа, перакананняў стаяць у ланцужках салідарнасці з адчуваннем унутранай свабоды. І тыя хлопцы, якія давалі прысягу верна і добрасумленна абараняць сваю Айчыну ад пагроз, як знешніх, так і ўнутраных. Усе яны — тыя, хто ў «ланцужку», і тыя «агідныя нягоднікі амапаўцы» — усе яны наша моладзь. Але дзяржава, як і бацькі ў сям'і, нясе адказнасць за ўсіх сваіх дзяцей»,* — нагадаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт падкрэсліў: самае галоўнае — захаванне міру і парадку на беларускай зямлі, для таго каб яе жыхары маглі атрымліваць адукацыю, ствараць сем'і і даваць дарогу ў жыццё новым пакаленням беларусаў.

*«За вамі будучыня, але паверце, што лепш вучыцца на чужых памылках, а не на сваіх уласных. Таму прашу: захоўвайце розум халодным, пад якой бы падставай вас ні ўцягвалі ў палітычныя гульні»,* — звярнуўся да маладога пакалення Аляксандр Лукашэнка, а потым зноў папрасіў бацькоў удзяліць у гэты крытычны момант самую сур'ёзную ўвагу сваім дзецям, утрымаць іх ад ганебных учынкаў.

*«Трэба зберагчы моладзь ад згубных учынкаў! Нічога ў гэтых лялькаводаў не атрымаецца! Проста пацерпяць нашы людзі»,* — упэўнены Прэзідэнт.

Музыкі будуць і далей пісаць песні, сказаў ён, карціны перажывуць людзей і будуць радаваць многія пакаленні, сімвалы — як частку гісторыі і культуры — ніхто не забароніць і не забудзе.

*«Мова назаўжды будзе не толькі ў кожным нашым сэрцы, але і застанецца падмуркам дзяржаўнай незалежнасці,* — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — *Але свет адкрыты. У ім перамяшчаецца ўсё: і тавары, і грошы, і людзі. У першую чаргу моладзь — як самая актыўная і рухомая частка любога грамадства. Пры гэтым кожная дзяржава хоча ўтрымаць самых таленавітых у сябе. Мы — не выключэнне. Беларуская дзяржава заўсёды падтрымлівала і будзе падтрымліваць моладзь».*

У маладых людзей ёсць магчымасць атрымаць не толькі бясплатныя сярэднюю і вышэйшую адукацыю, але і гарантаванае першае рабочае месца, дадаў ён. У сучасным свеце гэта дарагога варта і, па словах Прэзідэнта, выпадак, калі беларускія студэнты ў Польшчы аказаліся нікому, акрамя Беларусі, не патрэбныя падчас пандэміі — яскравае таму сведчанне.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вельмі важна стварыць умовы для запатрабаванасці моладзі ў Беларусі. Прыклад таго, што гэта робіцца, — развіццё IT-галіны, медыцыны, касмічных тэхналогій, атамнай энергетыкі. Калі нехта з'язджае за мяжу па лепшую долю, яго не трымаюць, дадаў Прэзідэнт. Ім ганарацца, яго з радасцю прымуць, калі што, назад, але не трэба тым, хто з'ехаў, абражаць сваю Радзіму, якая дала пачатак усяму.

*«Мне заўсёды вельмі цікавыя думкі і ідэі маладых людзей. Галоўнае, каб яны рухалі нашу краіну наперад. Лічу, што будучая пяцігодка павінна стаць пяцігоддзем маладой Беларусі. Равеснікі незалежнасці, тыя, каму сёння 25—30 гадоў, — самае актыўнае і перспектыўнае пакаленне, здольнае надаць магутны імпульс развіццю краіны, зрабіць яе канкурэнтаздольнай і паспяховай у самых розных сферах. Сфарміраваць аблічча новай Беларусі, накіраванасць у будучыню»,* — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## БІТВА, ЯКУЮ МЫ АБАВЯЗАНЫ ВЫЙГРАЦЬ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: мы жывём у эпоху лічбавізацыі і штучнага інтэлекту, гэта эпоха высокаадукаваных людзей, і трэба даць магчымасць кожнаму атрымаць якасную адукацыю, калі ў яго ёсць здольнасці і жаданне.

*«Вы ведаеце, можна было сёння ўвогуле ні пра што не казаць, але сказаць толькі пра адно — пра адукацыю,* — дадаў ён. — *Неадукаваны чалавек — страшны чалавек у будучыні. Вы ў гэтым пераканаецеся, мы з вамі ў гэтым жыцці хутка пераканаемся — толькі адукаваны чалавек, які сябруе з розумам, можа разважаць і зразумець, што адбываецца ў свеце. Усіх астатніх, хто не ўмее думаць, а думае айфонам або тэлефонам, будуць крамсаць, дзяўбсці, ціснуць не на свядомасць, а на падсвядомасць і замбіраваць. У гэтым найвялікшая небяспека асноўнай самай небяспечнай тэндэнцыі развіцця нашага грамадства. І калі мы ва ўсім свеце, вядучых краіны, зараз не падхопімся і не вырашым гэтае пытанне, то будзем мець планету хаосу».*

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў сваю ідэю пра тое, што на ўступных іспытах за вынікамі ЦТ неабходна бачыць абітурыента — чалавека з яго здольнасцямі і талентамі.

*«Новы фармат уступных экзаменаў у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы ўлічыць вопыт і тэсціравання, і сумоўя,* — паабяцаў ён. — *Мы ўзмоцнім практыкаарыентаванасць прафесійнай адукацыі. Чалавек працы заўсёды быў і застанецца асновай развіцця дзяржавы».*

Яшчэ адзін аспект адукацыі — выхаванне. Не будзем займацца сваімі дзецьмі мы — імі зоймуцца іншыя, падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён выказаў пажаданне, каб маладзёжную палітыку не зводзілі толькі да пытанняў матэрыяльных выгод і сацыяльных гарантый.

*«Хай гэта гучыць пафасна, але нас, старэйшае пакаленне, калісьці вучылі Радзіму любіць як бацькоў: не за тое, што яна добрая і паспяховая, а таму, што дала нам жыццё,* — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — *Мы проста абавязаны выйграць бітву за розумы і душы людзей, перш за ўсё моладзі. Паглядзіце, што робіцца ў інфармацыйнай прасторы».*

## «МЭТА — СУТЫКНУЦЬ ЛЮДЗЕЙ АДЗІН З АДНЫМ»

На думку Аляксандра Лукашэнкі, свет увайшоў у эпоху гібрыдных войнаў і «каляровых рэвалюцый», і «калі ўчора яшчэ нам здавалася за падобнымі сцэнарыямі збоку, то сёння ўжо фактычна ўцягнутыя ў такія канфлікты».

З гэтай мэтай шырока выкарыстоўваюцца магчымасці інфармацыйных рэсурсаў — інтэрнэту, месенджараў і сацыяльных сетак.

*«У выніку за мінулыя месяцы сацсеткі і тэлеграм-каналы наводнены лухтой, брудам, бессаромнай хлуснёй. Людзі страцілі сумленне, і я ўжо не кажу пра тых, каго я ўзрасціў на сваіх руках і грудзях,* — сказаў Прэзідэнт. — *Але вы паглядзіце на нашых творцаў. Яны ўчора кланяліся, радаваліся, пелі, танцавалі. Што з імі зрабілася за суткі?»*

Прэзідэнт папрасіў сысці ўбок тых людзей, якія перашкаджаюць выратоўваць краіну і самі не гатовы да гэтага: *«Скажу сёння для ўсяго свету... Улада і я як дзеючы Прэзідэнт прыме любы ваш выбар, толькі ніколі не здраджвайце. Здрада не даруецца нават на нябёсах. Калі вы не здольныя і да чагосьці не гатовы, сыдзіце ўбок. Не перашкаджайце, не блытайцеся пад нагамі, дайце выратаваць краіну».*

Па яго словах, праз год-два сітуацыя нармалізуецца, але вырашаць нешта сёння на эмоцыях нельга.

*«Мы меркавалі і не памыліліся, што ў цяперашняй выбарчай кампаніі будуць маштабна выкарыстоўвацца ўсе гэтыя метады ўздзеяння. Мэта — сутыкнуць людзей адзін з адным, падмануць, напалохаць, заблытаць і ў канчатковым выніку справакаваць на крымінальныя злачынствы. Так, гарачай вайны няма, спускавы кручок не націснуты, але спроба арганізаваць бойню ў цэнтры Мінска ўжо відавочная,* — перасцярог кіраўнік краіны. — *Супраць Беларусі кінутыя мільярдныя рэсурсы. Мабілізаваны найноўшыя тэхналогіі».*

Прэзідэнт падзяліўся, што са здзіўленнем назірае за дыскусіяй, якая існуе ў інтэрнэце наконт затрымання баевікоў з Расіі.

# «Мы сёння моцна трымаем у руках сваю будучыню. Будучыню незалежнай Беларусі»

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

*«Гэта вельмі небяспечны і моцны сігнал. І ўсё гэта хлусня пра Стамбул, Венесуэлу, пра Афрыку і Лівію. Гэта ўсё хлусня. Гэтыя людзі, яны далі паказанні, былі накіраваны спецыяльна ў Беларусь. Каманда была чакаць. Білеты, купленыя на Стамбул, — гэта легенда»*, — расказаў ён.

Паляцець у Стамбул, заўважыў Лукашэнка, магчыма з рэгіёнаў Расіі, але затрыманыя рухаліся чамусьці праз Беларусь.

*«Мы маем сваю краіну. Краіна мае свае законы. Каму, як не нашым родным братам расіянам і яе кіраўніцтву, ведаць гэтыя законы. Закон ёсць закон»*, — дадаў ён.

Прэзідэнт расказаў, што следчыя пачалавечы ставяцца да затрыманых, і гэта дало эфект.

*«Яны расказалі ўсё. Я хачу, каб з гэтай трыбуны тыя, хто сядзіць тут, і тыя, хто мяне пачуе, запомнілі: перастаньце хлусіць і несці мешаніну ў сродках масавай інфармацыі, — звярнуўся Прэзідэнт. — Мы — родныя людзі, мы — беларусы, украінцы, рускія, палякі, яўрэі — заўсёды жылі ў міры, не падкідвайце тут ядзернай зброі, не ўзрывайце абстаноўку, бо будзе палыхаць да Уладзівастока»*, — перасцярог Аляксандр Лукашэнка.

Ён паведаміў, што з'явілася інфармацыя аб яшчэ адным атрадзе, які зламыснікі кінулі на поўдзень краіны.

*«Мы павінны, калі ідзе ўборка ўраджаю, іх лавіць, бегаць па лясах. Мы ж іх усіх зловім»*, — не сумняваецца Прэзідэнт.

## МІСІЯ ВЕРТЫКАЛІ

Па словах Прэзідэнта «цэлая армія інтэрнэт-троляў і інфармацыйных правакатараў працуе дзень і ноч, каб дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне».

*«Знайшлі гэтых трох няшчасных дзяўчынак, яны не разумеюць, што чытаюць. Што вы ім пішаце? Правядзём «нячэсныя» выбары, выпусцім эканамічных, палітычных крымінальнікаў, правядзём «чэсныя» выбары і будзем жыць. Вы ж ім падкажыце, што не Прэзідэнт у Беларусі прызначае выбары. Пасля «нячэсных» выбараў ніколі беларускі парламент не ўгоніць краіну ў шэраг перадвыбарчых кампаній. Вы аб гэтым падумайце»*, — парапсіў Прэзідэнт і адзначыў, што ён ведае, хто стаіць за гэтымі асобамі.

Прэзідэнт паведаміў, што сёння робіцца шэраг вельмі сур'ёзных крокаў па супрацьстаянні пагрозе дэстабілізацыі, і задача нумар адзін — падрыхтаваць свае войска першакласных спецыялістаў, здольных супрацьстаяць і кіберпагрозам, і самым дасканалым тэхналогіям.

*«Вы не папракайце Лукашэнку і дзяржаву, што мы прайгралі бітву ў інтэрнэце. Успомніце, што казаў: мы дзяржава, мы ніколі не выйграем бітву ў інтэрнэце, таму што яна «жоўтая». Мы не можам спусціцца на ўзровень «жаўцізны»*, — растлумачыў Прэзідэнт.

На яго думку, чалавек, які хоча разабрацца ў сітуацыі, бачыць не толькі інтэрнэт, але і іншыя СМІ. Як адзначыў кіраўнік краіны, менавіта на нашым грамадстве вырашылі апрабаваць «каляровыя рэвалюцыі» з улікам новых тэхналогій.

*«Не атрымаецца. Дзяржава пачынаецца з народа, а трымаецца на моцнай і стабільнай кіраўніцкай вертыкалі. Пакуль гэтая вертыкаль моцная, карыстаецца даверам народа — краіну немагчыма расхістаць! Нам зайздросцілі. Чаму? Таму што ад Прэзідэнта да селяніна мы былі адным цэлым»*, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт анансаваў, што ў найбліжэйшы час зоймецца назапашанымі пытаннямі дзяржслужачых і ваенных.



Фота Якуба ПЯСЕЦКАГА.

На думку Прэзідэнта, калі хочуць падарваць аснову дзяржавы, то пачынаюць з нападаў на людзей, якія аддана служаць краіне і народу.

*«Асабліва сёння мы павінны гэта дакладна разумець. У нас у краіне кампактны дзяржаўны апарат. Мы не распесцілі нашых чыноўнікаў ні заробкамі, ні прывілеямі. Мы вельмі сурова ставімся і будзем ставіцца да праяў карупцыі. Патрабавалі і будзем патрабаваць дысцыпліны, чулых, уважлівых адносін да людзей. І калі вы чуеце мае бескампрамісныя выказванні на адрас тых ці іншых кіраўнікоў — гэта зусім не значыць, што ўвесь наш дзяржаўны апарат складаецца з нейкіх гультаёў або казнакрадаў»*, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт раіць перад тым, як папракаць дзяржслужачых, паглядзець на сябе. Дзяржслужачыя — адлюстраванне народа, бо яны прыйшлі з грамадства.

*«Але ведайце: на гэтых людзях трымаецца кіраванне краінай. Яны — хрыбет дзяржаўнай сістэмы. Гэта прафесіяналы, аддыныя краіне і народу*, — падкрэсліў лідар. — *Звяртаючыся да дзяржслужачых, скажу: я цудоўна бачу і ведаю цяжкасці, з якімі вы сутыкаецеся. Але ў найбліжэйшы час мы ўшчыльную зоймемся ўсімі назапашанымі пытаннямі дзяржслужачых і ваенных»*.

## БЯСПЕКА ЧЛЕНАЎ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

Па словах Прэзідэнта, члены выбарчых камісій і ЦВК адчуваюць каласальны прэсінг. На членаў выбаркамаў сыплюцца пагрозы і абразы, але, як запэўніў Аляксандр Лукашэнка, яны павінны ведаць, што дзяржава іх не кіне.

*«Мы знайшлі ўправу на гэтых экстрэмістаў. Таму не турбуйцеся ні за сваё жыццё, ні за сваю бяспеку, ні за бяспеку вашых дзяцей. Я вам гэта гарантую»*, — заявіў беларускі лідар.

Ён даў параду тым, хто хоча іншага Прэзідэнта: *«Ідзіце не на плошчу, а на выбарчы ўчастак, галасуйце. Але не забывайце, што Прэзідэнт — гэта кіраўнік дзяржавы, які па Канстытуцыі ўвасабляе адзінства нацыі, які з'яўляецца тварам нацыі»*.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што тыя, хто ўжо на стадыі электаральнай кампаніі робіць стаўку на пратэсныя настроі, дзеляць народ на сваіх і чужых, — разарвуць спачатку грамадства, потым краіну на часткі.

*«Мы нікому не закрываем рот. Любая крытыка, любыя думкі, любыя спрэчкі — усё магчыма. Але строга ў рамках закона. Дазволеная акцыя — прыходзь і выказвайся. Забароненая — май на ўвазе, што гэта прамое правапарушэнне. І парушальнікам з'яўляецца не толькі арганізатар, але і любы ўдзельнік»*, — паведаміў ён і параіў адрозніваць рэальную палітыку, рэальную апазіцыю і «фанерных марыянетак».

Па яго словах, добра вядомыя тыя «фабрыкі», з канвеера якіх сыходзяць такія кандыдаты — з'яўляюцца, падманваюць, правакуюць, падстаўляюць людзей, а потым спісваюцца ў тыраж сваімі ж гаспадарамі.

Як запэўніў Прэзідэнт, такіх рэформаў (як прапануюць — вывесці капіталы ў афшоры, прымусіць усіх плаціць за медыцыну і адукацыю, землі сельгаспрызначэння зрабіць прыватнымі і спустошыць працоўныя калектывы) у Беларусі не будзе.

## УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З КАНСТЫТУЦЫІ

Калі грамадству патрэбныя перамены, то яны будуць, паабяцаў Прэзідэнт.

*«Усе рэформы павінны пачынацца з Канстытуцыі. Не з вулічных акцый, а менавіта з Асноўнага Закона*, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — *Вяртанне да Канстытуцыі 1994 года — поўны абсурд. Трэба рухацца наперад. І гэта датычыцца не толькі эканомікі, але і палітыкі. Сёння цалкам іншыя патрэбы. Канстытуцыя павінна не толькі ім адпавядаць, але і на некалькі крокаў апярэджваць грамадскае развіццё. Яна павінна стаць «дарожнай картай» для краіны»*.

Пакуль на пытанне, якой ёй быць у цэлым і ў дэталях, беларусы не адказалі, але адкажуць у працэсе грамадскага абмеркавання, дадаў Прэзідэнт і запэўніў, што ўжо сённяшні склад парламента абавязкова выпрацуе і прапануе народу новы варыянт Канстытуцыі.

*«Прапановы могуць быць розныя*, — сказаў ён. — *У тым ліку і ў галіне партыйнага будаўніцтва, пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады. Я асабіста гатовы да любых змен, калі яны будуць ісці на карысць народу і калі гатова да іх вы»*.

Але галоўнае — Канстытуцыя не павінна правакаваць палітычны крызіс, выклікаць параліч кіраўніцкай сістэмы, як гэта было ў сярэдзіне 90-х, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Ён напомніў, як тады ўлада краіны захрасла ў бясконцых палітычных спрэчках і дэбатах ва ўрон прыняццю неадкладных рашэнняў. Тым часам краіна кацілася ў бездань, а народ апынуўся на мяжы выжывання. Прэзідэнт зноў нагадаў пра беззаконне, якое маладой Беларусі прыйшлося пераадолець у 90-х гадах.

*«Так, у Беларусі за многае адказвае Прэзідэнт, які валодае вялікімі паўнамоцтвамі. Гэта вызначальная гарантыя рэалізацыі сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы перад людзьмі. Але ці гатовыя вы, беларусы, гэтыя паўнамоцтвы з гэтай Канстытуцыі перадаць іншаму?* — задаў ён пытанне. — *Я не святы, у мяне ёсць усё — і добрае, і дрэннае. Але вы мяне ведаеце, вы ведаеце, на што я пайду, а на што — не, што магу, а што не. Вы ведаеце, што ваша жыццё для мяне святое. Усё, астатняе забудзьце. Заўтра прыйдзе, возьме чалавек, новы, невядомы, гэту Канстытуцыю — якую палітыку ён будзе праводзіць? Вы яго ўтрымаеце ад абвальнай прыватызацыі? Вы яго ўтрымаеце ад таго, што ён спіхне краіну ўлева ці ўправа? Утрымаеце. Сёння ўжо ўтрымаеце і без мяне»*.

У гэты крытычна важны для краіны момант беларусы павінны дакладна ўсведамляць: права на памылку няма, дадаў лідар.

*«Яшчэ адзін канстытуцыйны тэзіс, які з'яўляецца стрыжнем маёй палітычнай дактрыны, — дзяржава павінна ствараць чалавеку ўсе магчымасці для дасягнення яго мэт*, — сказаў ён. — *Але кожнаму трэба разумець, што без штодзённай працы і адказных адносін яго мара застанецца проста марай»*.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што зараз за Беларуссю назірае ўся постсавецкая прастора: *«Мільёны ўражаных і зацікаўленых вачэй народаў Узбекістана і Таджыкістана, Казахстана і Туркменістана, Каўказа, брацкіх нам Расіі і Украіны сапраўды ў гэтыя дні звернутыя да нашай Радзімы, да нашай шматпакутнай Беларусі. У іх поглядах адно пытанне: «Ці вытрымае Беларусь? Ці зможа выстаяць у гэтай гібрыднай схватцы, у гэтай вайне?» Яны разумеюць: калі беларусы паваляцца, наступнымі будуць яны!»*

На яго думку, *«усе стрэлы атрутныя накіраваныя сёння супраць Лукашэнкі: зваліць, зняважыць, растаптаць, знішчыць»*.

*«Дык вось ведайце, нават без мяне беларускі народ зможа сябе абараніць!* — падкрэсліў ён. — *Таму што ведае, што іншай зямлі ў свеце, акрамя Беларусі, у яго не будзе. Нідзе — ні ў Аўстраліі, ні ў Штутгарце — ім месца няма. У афшорах грошай таксама няма. А ў лапці абуць народ вам не ўдасца і пад бізун загнаць ужо не атрымаецца»*.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што і міліцыя, і армія, і спецслужбы — гэта дзеці тых, каго хочуць «запрэгчы ў калёсы і паганяць пугай» і яны гэтага зрабіць не дазволяць нават без яго.

*«Вы спазніліся роўна на чвэрць стагоддзя*, — дадаў ён. — *Мы сёння моцна трымаем у руках будучыню. Будучыню нашай незалежнай Беларусі. Краіну мы вам не аддадзім. Незалежнасць каштуе дорага. Але яна вартая таго, каб яе захаваць і перадаць будучым пакаленням»*.

Аляксандр Лукашэнка завяршыў сваё Пасланне наступнымі словамі: *«За намі Беларусь — чыстая і светлая, сумленная і прыгожая, працавітая, трошкі наіўная і крыху ранімая. Але яна — наша, яна — любімая, а любімую — не аддаюць!»*

Гэтыя словы Прэзідэнта Палац Рэспублікі сустрэў апладысментамі, якія цягнуліся дзве з паловай хвіліны.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Варвара МАРОЗАВА.**

Уражанні

# РАЦЫЯНАЛЬНА І ЭМАЦЫЯНАЛЬНА

## Пасланне Прэзідэнта закранула кожнага слухача — уражаннямі падзяліліся ўдзельнікі мерапрыемства

### АДПАВЯДАЦЬ ВЫСОКАМУ СТАНДАРТУ



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ у Пасланні Прэзідэнта для сябе адзначыў два блокі.**

— Перш за ўсё, гэта быў рацыянальны, глыбока прадуманы раздзел аб шляхах і кірунках рэфармавання нашай краіны. Аж да таго, што называліся канкрэтныя галіны, кірункі развіцця. Гэта захаванне сацыяльнага характару беларускай дзяржавы з акцэнтам на развіццё сістэм аховы здароўя і адукацыі. Кіраўнік дзяржавы ўвогуле сказаў знакавыя словы, якія, упэўнены, запомняцца ўсім удзельнікам, што толькі адукаваны чалавек па сутнасці справы можа быць асновай беларускага грамадства. Гэта фундаментальны прынцып XXI стагоддзя, сапраўды, гэта так.

І другі момант — эмацыянальны. Адчувалася, што Прэзідэнт вельмі востра перажывае бягучыя праблемы развіцця нашай краіны, што для яго дабрабыт беларускіх людзей і беларускай дзяржавы — у разы, у дзясяткі разоў важнейшыя за яго ўласны лёс, за яго нейкія асабістыя дасягненні.

Ён гатовы кінуць усё на алтар дабрабыту і развіцця нашай краіны. Гэты эмацыянальны пасыл, вядома, зараджае і нас усіх (перш за ўсё, дэпутатаў), каб дзейнічаць, калі хочаце, адпаведна з гэтым высокім прэзідэнцкім стандартам.

### ПЫТАННЕ НУМАР АДЗІН



**Старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве Святлане ЛЮБЕЦКАЙ больш за ўсё запомнілася шчырая і вельмі чалавечная пастаноўка пытанняў, якія сёння хвалююць кожнага.**

— Я думаю, незалежна ад таго, гэты чалавек — чыноўнік, работнік сельскай гаспадаркі, выкладчык ці жанчына ў дэкрэце, усе сферы жыцця былі ахоплены: пытанні, якія хвалююць сёння (знешняй і ўнутранай палітыкі) — як мы будзем жыць далей, пытанні развіцця эканомікі, падтрымкі моладзі, пенсійнага забеспячэння...

Увогуле бачанне далейшага жыцця, яго якасці — сёння гэта пытанне нумар адзін. І тое, як эмацыянальна Прэзідэнт аб гэтым казаў, сведчыць аб тым, што гэта пытанне яго хвалюе штодня. Кожны мусіць пачуць і ўбачыць сваю будучыню і вырашыць для сябе, дзе ён і з кім.

### КРАНАЕ СЭРЦА



**Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі Алег РУМО ўражаны Пасланнем.**

— Калі кажуць пра будучыню тваёй краіны, напэўна ж, сэрца гэта кранае. Урачы — людзі эмацыянальныя, проста умеюць не даваць волі эмоцыям, калі гэта неабходна. Зараз менавіта такі момант, бо будучыня краіны на коне.

Тое, што сказаў Прэзідэнт, — вельмі змястоўна, перш за ўсё. І вельмі ярка. І гэта тое, што патрэбна сёння нашай краіне. Я ўпэўнены, што ў нас ёсць адзін шлях — толькі такі, іншага шляху ў нас няма.

### ЛЕЙТМАТЫЎ — РАДЗІМА



**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар ХЛАБУКІН звярнуў увагу на новы, незвычайны па працягласці фармат Паслання, карацейшы за папярэднія.**

— Час дынамічны, мяняецца, таму — ёмiста, сцісла, вельмі канструктыўна прайшло, на адзіным парыве. Эмоцыі сапраўды перапаўнялі і ўсіх нас, і кіраўніка дзяржавы, таму што гэта ўсё было пабудавана ўсімі намі — беларусамі. І гэта мы мусім захаваць.

Вядома, асноўнымі тэмамі былі захаванне суверэнітэту, нашай цэласнасці, тэма моладзі, сацыяльнай сферы — тое, на чым мы стаім, чым ганарымся і чаго няма ў суседніх дзяржаў. Напэўна, гэты вось клопат аб усіх без раздзялення на больш ці менш моцных ці слабых — вельмі важны складнік, які мы павінны захаваць. Роўнасць кожнага беларуса, кожнай сям'і, стварэнне, захаванне нашай зямлі, нашай Радзімы былі лейтматывам.

І мы сёння мусім зрабіць усё магчымае, нягледзячы на розныя меркаванні, нейкія прывязанасці сабрацца ў адно і сур'ёзным, адзіным фронтам выступіць за нашу дзяржаўнасць, за нашу краіну.

**Запісала Варвара МАРОЗАВА.**

З першых вуснаў

# «Выбары ў Беларусі пройдуць у строгай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам»

## Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора падчас сустрэчы са старшынямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, сваімі памочнікамі па абласцях і Мінску

**Учора з пачаткам датэрміновага галасавання краіна ўступіла ў завяршальную стадыю выбарчай кампаніі.**

Як далажылі Аляксандру Лукашэнку, работа ідзе ў штатным рэжыме, усе 5,8 тысячы ўчасткаў для галасавання ў краіне і за мяжой працуюць. Разам з тым, Прэзідэнт зноў пацікавіўся, ці ўсё зроблена з пункту гледжання матэрыяльнага забеспячэння кампаніі, арганізацыі, і запрасіў адказных далажыць, калі па рэгіёнах засталіся яшчэ нейкія праблемы.

«Па добрай беларускай, можа, і савецкай, традыцыі мы ***заўсёды выбары праводзілі як сапраўднае свята для людзей***: і буфеты былі арганізаваны, і канцэртныя пляцоўкі. Прагаласаваўшы, людзі гатовыя былі паслухаць добрую песню, каб настрой быў ладны. Трэба і гэтым разам не забываць пра гэта свята», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Другое пытанне — бяспека правядзення выбараў. Аляксандр Лукашэнка загадаў ні ў якім выпадку не дапусціць, каб кіраўнікі камісій, наведвальнікі выбарчых участкаў прад'явілі нейкія прэтэнзіі, што іх бяспека не была забяспечана на годным узроўні. Па фактах, калі ёсць хоць найменшае падазрэнне, міліцыі і Камітэту дзяржбяспекі даручана самым жорсткім чынам рэагаваць.

«***Людзі дзяржаўныя, і дзяржава іх павінна абараніць. Нашых людзей трэба абараніць.*** Пагрозы, абразы і іншы гвалт павінны спыняцца на корані», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адно патрабаванне, каб у кожнага чалавека, хто мае права голасу, была магчымасць прыняць удзел у выбарах. Асаблівую ўвагу Прэзідэнт папрасіў звярнуць на старых, інвалідаў, хворых на каранавірус, якім трэба дапамагчы прагаласаваць.

«Па іх жаданні, каб яны маглі зрабіць свой выбар», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Па яго словах, у гэтую электаральную кампанію ў Беларусі акрэдытавана рэкордная колькасць назіральнікаў — больш за 45 тысяч.

«Ёсць і замежныя. Трэба акуратна, каб іх у добрым сэнсе клопатам — таму што гэта людзі гераічныя, яны не пабаяліся ў гэту пандэмію прыехаць у Беларусь з замежжа, хай нават з Расіі, Украіны, каб паглядзець, як ідуць нашы выбары. Таму да іх трэба адпаведныя адносіны. Яшчэ раз падкрэсліваю: выбары ў Беларусі пройдуць у строгай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам і выключна ў інтарэсах беларускага народа. Таму калі ў некага іншыя чаканні, то дарма. Беларускі закон, беларускі народ — гэта галоўнае», — працягнуў кіраўнік дзяржавы.

Але, як часта кажа Аляксандр Лукашэнка, «выбары выбарамі»: 9 жніўня ўвечары выбары скончацца, а 10-га давядзецца займацца цяжкай, камусьці, мабыць, нецікавай руцінай. Але без яе жыцця не бывае, упэўнены лідар краіны.

«Яшчэ раз увага сялянам. Паглядзіце, каб мы не расслабіліся, асабліва ў гэты тыдзень. Надвор'е стаіць гарачае. Трэба скарыстацца і асноўную масу збожжавых каласавых убраць. ***Найпершая задача — гэта сабраць хлеб.*** Ён добры, яго страціць нельга», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Ён даручыў адказным асобам у час, які назваў «экзаменам» для ўсіх, каб уся інфраструктура функцыянавала нармальна.

«Ад сувязі да транспарту. ***Трэба зрабіць так, каб усе арганізацыі інфраструктурныя працавалі як гадзіннік.*** Гэта добрая праверка, гэта як у ваенных на вучэннях», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Лідар дзяржавы нагадаў, што беларусы заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у выбарах, і даручыў сваім памочнікам і губернатарам папрасіць грамадзян, нягледзячы на летні перыяд і клопаты, знайсці цягам тыдня час і прыйсці прагаласаваць.

«Я думаю, людзі ў нас свядомыя (не думаю — ведаю) і адгукнуцца на нашу просьбу паўдзельнічаць у гэтых выбарах», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Парламенцкі дзённік

## «Попыт на праўду і справядлівасць расце. Таму фармалізм, раўнадушша і дыстанцыяванне недапушчальныя»

**У Савеце Рэспублікі адбылося закрыццё трэцяй пазачарговай сесіі. Віцэ-спікер верхняй палаты парламента Анатоль ІСАЧАНКА звярнуў увагу сенатараў на тое, што Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту павінна стаць прадметам глыбокага аналізу і кіраўніцтвам да дзеяння кожнага.**

«Савет Рэспублікі таксама павінен зрабіць важкі ўнёсак у практычную рэалізацыю палажэнняў Паслання. Абарона інтарэсаў айчынных вытворцаў, падтрымка сацыяльна адказнага бізнесу, стварэнне камфортных умоў жыцця на вёсцы, забеспячэнне раўнамернага развіцця рэгіёнаў, супрацьдзеянне пагрозам на інфармацыйным полі — у вырашэнні гэтых і іншых задач павінен прыняць самы актыўны ўдзел Савет Рэспублікі, — акцэнтаваў увагу Анатоль Ісачанка. — Паўнамоцтваў у нас для гэтага дастаткова».

Ён адзначыў, што абавязак сенатараў — данесці ключавыя тэзісы звароту Прэзідэнта да грамадзян, правесці шырокую растлумачальную работу, прыцягнуць да яе дэпутатаў мясцовых Саветаў.

«Важна арганізаваць гэту работу ў фармаце дыялогу. Трэба ведаць і разумець, што думаюць людзі аб праблемах, закранутых кіраўніком дзяржавы, і якія шляхі іх вырашэння бачаць. Зваротная сувязь дазволіць дасягнуць максімальнага выніку ў рэалізацыі праграмных установак Прэзідэнта. Попыт на праўду і справядлівасць расце — гэта падкрэсліў у сваім Пасланні кіраўнік дзяржавы. Таму фармалізм, раўнадушша і дыстанцыяванне проста недапушчальныя», — пераканаы ён.

Анатоль Ісачанка падкрэсліў, што Беларусь заўсёды была і павінна застацца тэрыторыяй стабільнасці і дабрабыту. Гэтаму павінен садзейнічаць і Савет Рэспублікі.

«Узважаная канстытуцыйная рэформа, своечасовая актуалізацыя дзеючага заканадаўства, аператыўнае вырашэнне праблем, якія хвалююць суграмадзян, павышэнне эфектыўнасці ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў, актыўнае прасоўванне нацыянальных інтарэсаў метадамі парламенцкай дыпламатыі — усё гэта зона ўвагі і адказнасці парламентарыяў», — падкрэсліў віцэ-спікер верхняй палаты парламента.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## «Наша задача — данесці стваральны сэнс кожнага тэзіса Паслання да выбаршчыкаў»

**У Палаце прадстаўнікоў закрылася трэцяя, самая кароткая сесія. Яна мела самае кароткае заключнае пасяджэнне, якое склала толькі выніковая прамова старшыні ніжняй палаты парламента Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ. Ён ахарактарызаваў Пасланне як сапраўды адкрытую і шчырую размову, падчас якой дэпутаты атрымалі адказы на самыя актуальныя пытанні, якія хвалююць сёння беларускае грамадства.**

«Залогам паспяховага пераадолення цяжкасцяў, абумоўленых абвастрэннем глабальных геапалітычных супярэчнасцяў і сусветным крызісам, які ўзмацняецца, з'яўляецца яднанне і згуртаванне народа, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Ніхто, акрамя саміх беларусаў, не забяспечыць незалежнасць краіны, мір, стабільнасць і грамадскі дабрабыт».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў упэўнены, што абсалютная большасць нашых грамадзян цалкам падзяляе гэты галоўны пасыл Прэзідэнта.

«Наша задача, паважаныя калегі, — аб'ектыўна, без эмоцый данесці стваральны сэнс кожнага тэзіса Паслання да выбаршчыкаў. Будзе няпроста. Мы бачым, як нагнятаецца сітуацыя, якія намаганні і немалыя фінансавыя сродкі ўкладваюцца ў тое, каб разгайдаць краіну, збіць з панталыку нашу моладзь адараванымі ад рэальнасці безадказнымі лозунгамі», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Яшчэ адна наша задача для дэпутатаў у перадвыбарчы час — работа з міжнароднымі назіральнікамі, калегамі-парламентарыямі. Як дадаў спікер Палаты прадстаўнікоў, дэпутаты павінны максімальна садзейнічаць таму, каб свет пабачыў аб'ектыўную карціну таго, што адбываецца.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Карысна ведаць

## НЯЗВАНЫЯ ГОСЦІ

### Як абясшкодзіць ежу, рэчы і пасцель ад жукоў, молі, кляшчоў і іншых паразітаў

**Насякомыя трапляюць на кухню рознымі шляхамі. Пранікаюць з вуліцы праз вокны і шчыліны, перапаўзаюць ад суседзяў, асабліва калі тыя іх труцяць. А яшчэ насякомых можа быць поўна ў прадуктах, якія мы прыносім з магазінаў, бо жучкі на прылаўках — звычайная рэч. Прычым харчовыя насякомыя моцна адрозніваюцца ад сваіх лясных сурадзічаў, хоць знешне яны і падобныя. Ад прадуктаў, у якіх корпаліся нязваныя «госці», можна падхапіць інфекцыю і атрымаць атручванне іх экскрэментамі, бо кожны паразіт выдзяляе адходаў у дзясяткі разоў больш за ўласную вагу.**

Калі на кухні завяліся мурашкі, то самастойна іх вывесці наўрад ці ўдасца: у адрозненне ад лясных братоў, яны засяляюць прасценкі, шчыліны ў падлозе і падмурку, прастору за шпалерамі, нават складкі ў адзенні, вазы і апаратуру — усё, дзе цёпла, цёмна і недалёка ад ежы. Тут патрэбная прафесійная дэзынфекцыя.

Важна падтрымліваць парадак на кухні, прывучыўшыся герметычна ўпакоўваць рэшткі ежы ў кантэйнеры. Напрыклад, крупы трэба перасыпаць з заводскай пластыкавай упакоўкі ў бляшаныя, шкляныя ці тоўстыя пластыкавыя слоікі. Заводскі поліэтылен насякомыя лёгка прагрызаюць. Прычым, пакуль яны не вылупіліся, нельга зразумець, чыстыя крупы ці не. Але з дапамогай простага лайфхаку можна знішчыць дробных шкоднікаў, не раскрываючы ўпакоўку. Для гэтага крупы адразу ж пасля магазіна кладуць на пару дзён у маразілку. Тады ўсе лічынкі гінуць без усякай хіміі. А вось калі яны ўжо вылупіліся і распаўзліся па ўсёй кухні, то заселеныя імі прадукты давядзецца выкінуць, усю кухню памыць з мылам і содай, працерці шафы воцатам і перастаць набываць муку і крупы ў запас.

Моль, лічынкі якой харчуюцца крупамі, арэхамі і мучным, — шэрая, а тая, што есць тканіны, — белая, так званая адзежная. І за той, і за другой ганяцца з тапкам бессэнсоўна. Бо дарослая моль, якая лятае, увогуле нічога не есць, у яе нават рота няма, а лічынак яна ўжо, хутчэй за ўсё, адклала. Хаваецца моль у шафе ці за канапай і рыскае ў пошуках кераціну — рэчыва, з якога складаецца скура ўсіх млекакормячых, ногці, а асабліва валасы і поўсць.

Спецыялісты лічаць бессэнсоўнымі лаванду, хвою, апельсінавую корку, іншыя народныя сродкі барацьбы з гэтымі шкоднікамі, бо моль да іх хутка адаптуецца. Калі павесіць у шафу мяшочак з лавандай, а моль ужо была ў ім дагэтуль, то народжанаму ў лавандавай атмасферы пакаленню гэты моцны пах будзе ані ў знак. Адзінае, што можа падзейнічаць, — гэта каўказскі рамонак, у якім утрымліваецца прыродны яд пірэтрын. Але лепш за ўсё перабіраць рэчы ў шафе хоць раз на месяц. Моль развіваецца каля 40 дзён — ад матылька да матылька. Ёй трэба, каб яе не чапалі. А калі вы ўвесь час пераварочваеце рэчы, выцягваеце на вуліцу, на сонца, вусені загінуць.

Прагрэваць ці прамарожваць варта яшчэ і матрац, і падушкі з коўдрай — і не ад молі, а ад пылавых кляшчоў. Іх памер — усяго тры дзясятыя міліметра, і даследаванні паказваюць, што ў адным граме пылу корпаецца пяцьсот такіх мікрапаразітаў. А ў ложку іх можа быць два мільёны. Харчуюцца яны лускавінкамі нашай скуры. Чалавек скідвае паўтара грама мёртвых клетак у дзень, і гэтай колькасцю можна накарміць цэлы мільён кляшчоў. Таму іх шмат у пасцельнай бялізне, асабліва ў падушках, коўдрах і пярынах з натуральным пухам, які добра ўтрымлівае вільгаць. Для кляшчоў такія ўмовы — раскоша. Дарэчы, менавіта ў падушках ад сумнеўнага вытворцы гэтыя паразіты часта і трапляюць у дом.

Як і ў выпадку з жучкамі, для чалавека небяспечныя не самі кляшчы, а іх адходы — гуанін, які яны выдзяляюць дванццаць разоў на дзень. Гэта адзін з самых моцных алергенаў, які можа стаць прычынай бранхіяльнай астмы, рыніту, скурных захворванняў. Каб ад гэтага засцерагчыся, мікрабіёлагі раяць не набываць падушкі і коўдры з натуральным пухам. Зімой матрац можна цалкам прамарожваць на балконе некалькі гадзін, а летам — прагравець пад палячым сонцам. А заадно — дываны і іншыя пухнатыя пыла- і клешчазборнікі.

Скажыце, доктар...

Тлумачыць урач-афтальмолаг

# Чаму перад вачамі мільгаюць «мушкі»?

**Многія з нас заўважалі дзіўны рух ва ўласных вачах — плаваючыя памутненні рознай шчыльнасці, якія нібыта ўцякаюць ад нашага позірку. Аб прыродзе гэтай з'явы мы пагаварылі з урачом-афтальмолагам 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Мінска Мікітам ГУКАМ.**

***— Мікіта Сяргеевіч, што гэта за з'ява, вядомая многім як «мушкі» перад вачыма?***

— Гэта дэструкцыя шклопадобнага цела. Каб зразумець, чаму яна ўзнікае, патрэбны невялікі экскурс у анатомію. Шклопадобнае цела — гэта ўтварэнне гелепадобнай структуры, яно запаўняе вочны яблык знутры, надаючы яму форму. Другая яго важная функцыя — жывільная. Шклопадобнае цела больш чым на 90 % складаецца з вады, астатняе — калагенавыя валокны



і гіалуронавая кіслата. Калагенавыя валокны знаходзяцца адно ад аднаго на пэўнай адлегласці. Пры дэструкцыі адбываецца працэс, які носіць назву сінерэзіс. Гэта выдзяленне вадкасці — у нашым выпадку малекуламі гіалуронавай кіслаты. У паўсядзённым жыцці з гэтым працэсам сутракаецца кожны: калі мы пакідаем у халадзільніку ёгурт на некалькі дзён, то пасля, адкрыўшы яго, можна ўбачыць тонкі слой вады.

Пры выдзяленні вадкасці калагенавыя валокны пачынаюць траціць свае папярочныя сувязі, адлегласць паміж імі таксама парушаецца. Яны пераплятаюцца, утвараючы шчыльны клубок, які і кідае цень на сятчатку. А мы яе пачынаем візуалізаваць.

***— На што скардзяцца пацыенты ў такіх выпадках?***

— Ва ўсіх гэта праяўляецца па-рознаму: у кагосьці гарызантальныя ці вертыкальныя лініі, у некага кропка ці коска, якая, адпаведна, рухаецца за нашым поглядам управа-ўлева. Звычайна пацыенты кажуць, што паглядзелі на светлы фон і з'явілася нейкая кропка — здаецца, што гэта нейкая нітачка, павуцінка, якую хочацца прыбраць з вейкаў.

***— Гэтая паталогія застаецца на ўсё жыццё?***

— Так. Але ёсць два фактары, якія дазваляюць нам заўважаць тую «мушку» радзей. Па-першае, калагенавыя валокны асядаюць на вочнае дно, і з гэтай прычыны мы пачынаем бачыць іх не так часта. Па-другое, наш мозг мае ўласцівасць ігнараваць адлюстраванні, якія яго раздражняюць. Наша зрокавая кара робіць усё так, каб на некаторыя выявы мы не звярталі ўвагі. Таму людзі, якія доўгі час маюць дэструкцыю шклопадобнага цела, могуць заўважаць яе, толькі калі перастаюць канцэнтравацца на нейкім заданні, расслабляюцца і згадваюць пра сваю «мушку».

Гэта тлумачыцца яшчэ і тым, што ва ўсіх у нас ёсць сляпая пляма проста пасярэдзіне поля зроку. У цэнтры нашай сятчаткі знаходзіцца зрокавы нерв, таму там няма рэцэптараў. Наш мозг у гэтай зоне сам дабудоўвае карцінку. Мы не бачым сляпой плямы, але калі зрабіць даследаванне — статычную камп'ютарную перыметрыю, — у кожнага чалавека яна ёсць.

***— Ці можна пазбавіцца ад «мушак» перад вачыма пры дапамозе лекаў?***

— Метады лячэння дэструкцыі існуюць, але ўсе яны хірургічныя. І гэта міф, што ёсць кроплі ці капсулы (яны так і называюцца — ад «мушак» у вачах), якія нібыта могуць дапамагчы. Калі разумець, у чым сутнасць гэтага працэсу, то становіцца відавочна, што з ім немагчыма справіцца з дапамогай кропель: незразумела, як кропля можа пранікнуць у шклопадобнае цела і як яна можа растварыць менавіта тыя калагенавыя валокны, якія спляліся. Таму ўсё гэта не мае ніякіх абгрунтаваных падстаў.

***— Ці магчыма неяк прадухіліць гэтую хваробу?***

— Прафілактыкі дэструкцыі шклопадобнага цела таксама не існуе.

***— А хто звычайна сутыкаецца з гэтай з'явай?***

— Чаму ўзнікае дэструкцыя шклопадобнага цела, дагэтуль цалкам не высветлена. Можна вылучыць групу асоб, у якіх яна сустракаецца найчасцей. Гэта людзі пасля 50-55 гадоў, таксама тыя, хто пакутуе на міяпію, меў аперацыі на вачах, у тым ліку катарактальныя, пасля траўмаў вока. Таксама ў сваёй практыцы заўважаю, што некаторыя пачынаюць бачыць «мушку» пасля гіпертанічнага крызу. Дэструкцыя шклопадобнага цела — як катаракта: рана ці позна ўзнікне ва ўсіх, гэта толькі пытанне часу.

***— А ў дзяцей яна сустракаецца?***

— Так, яна бывае і ў дзяцей.

***— Раскажыце пра хірургічныя метады лячэння.***

— Першы з іх, дастаткова радыкальны, — вітрэктамія, або выдаленне шклопадобнага цела. Але гэта дастаткова траўматычная аперацыя, пасля якой можа ўзнікаць шмат ускладненняў. Пасля яе ў некалькі разоў павялічваецца рызыка развіцця глаўкомы, катаракты, адслаення сятчаткі. Такую аперацыю выконваюць толькі па строгіх паказаннях, і гэта зусім не дэструкцыя шклопадобнага цела, а найперш праліфератыўныя захворванні вочнага дна. І другі метад — гэта лазерны



вітрэалізіс, дастаткова паспяховая тэхналогія. Ёсць пэўныя паказанні да такой аперацыі — «мушка» павінна быць дастаткова вялікага памеру і знаходзіцца на адлегласці не больш чым за 2 мм ад сятчаткі, і не бліжэй чым за 2 мм ад хрусталіка. Калі яна будзе занадта блізка да хрусталіка ці сятчаткі, ёсць імавернасць, што падчас аперацыі лазер іх закране.

***— «Мушку» бачыць толькі пацыент ці яна заўважная і ўрачу?***

— Няўзброеным вокам урачу яна, як правіла, не відаць, яе можна заўважыць толькі на УГД. Праўда, бываюць «мушкі» дастаткова вялікіх памераў, і іх урач бачыць падчас непрамой афтальмаскапіі вочнага дна. І вось калі «мушка» менавіта такая і размяшчаецца адпаведным чынам, яе можна растварыць лазерным вітрэалізісам. Сутнасць аперацыі ў тым, што згустак калагенавых валокнаў расшчапляюць на драбнейшыя, і яны зноў становяцца незаўважнымі. Ёсць даныя даследаванняў, што ў пацыентаў пасля лазернага вітрэалізісу сапраўды добрыя вынікі, і паколькі аперацыя малаінвазіўная, ускладненняў амаль няма. Мяркую, у будучыні гэты метад будзе ўдасканальвацца і стане больш распаўсюджаным.

***— У нашай краіне ён сёння даступны?***

— У бюджэтных установах пакуль такіх аперацый не робяць, яны даступныя ў прыватнай клініцы «Аптымед».

***— Здаецца, што дэструкцыя шклопадобнага цела — даволі бяспечная з'ява, з якой можна жыць, не звяртаючы на яе ўвагі...***

— Калі прычына «мушак» у дэструкцыі шклопадобнага цела, то сапраўды гэта не так страшна. Але прычынай іх узнікнення, акрамя сінерэзісу, можа быць адслойванне шклопадобнага цела, якое адбываецца з узростам.

Шклопадобнае цела шчыльна прылягае да сятчаткі сваёй задняй гіялоіднай мембранай. І калі яно адслойваецца ад сятчаткі, у прыватнасці, у тых пунктах, дзе шчыльная сувязь, адбываецца авульсія (адрыў нейкай часткі ад цэлай структуры. — **«Зв.»**) сасудаў або разрыў сятчаткі. Часта дэструкцыя шклопадобнага цела сведчыць пра тое, што пачаўся працэс адслойвання шклопадобнага цела, бо гэта ўзаемазвязаныя рэчы. Таму калі ў вас з'явіліся «мушкі», варта неадкладна звярнуцца да ўрача, які павінен зрабіць агляд з фундус-лінзай і выключыць утварэнне разрываў, авульсію сасуда.

Нават калі няма гэтых прычын, працягвайце сачыць за сваім станам. Калі з'явіліся новыя «мушкі», пачалі непакоіць успышкі святла ці маланкі, раптам узнікла памутненне перад вачамі, варта зноў звярнуцца да доктара. Гэта можа сведчыць пра тое, што адбыліся разрыў сятчаткі, авульсія сасуда або гемафтальм (кровазліццё ў шклопадобнае цела). Гемафтальм бывае частковы — калі з'явілася невялікая колькасць новых мушак, але яны з часам рассмоктваюцца. А здараецца субтатальны гемафтальм, калі вока цалкам заліта крывёй знутры і вы імгненна траціце зрок. Як правіла, за тры месяцы кроў таксама рассмоктваецца, і зрок аднаўляецца. Тым не менш з'яўленне «мушак» — сур'ёзны сігнал для таго, каб звярнуцца да афтальмолага, які павінен рэкамендаваць вам агляд з фундус-лінзай для абследавання перыферыі вочнага дна. У некаторых паліклініках, у прыватнасці ў нашай, фундус-лінза ёсць, і гэтае даследаванне робіцца на месцы — пацыенту нават не трэба звяртацца ў бальніцу.

# РАБОЧЫ ДЗЕНЬ — НЕНАРМАВАНЫ

## Улетку работнікам сельскай гаспадаркі не хапае яшчэ адной гадзіны ў сутках

**Па выніках перапісу насельніцтва мінулага года, каля 77,5 % беларусаў жывуць у гарадах. Адпаведна, у сельскай мясцовасці пражывае ўсяго 22,5 % нашых суграмадзян. Такім чынам, прафесія хлебароба становіцца ўсё больш рэдкай і «эксклюзіўнай». Жніво — добрая нагода паглядзець, як жывуць людзі, чыя праца ў прамым сэнсе корміць краіну.**

Калі ў горадзе дзяўчаты хочуць замуж за айцішніка, то ў вёсцы кажуць, што спадарожніка жыцця варта шукаць сярод камбайнераў — яны не баяцца работы і ўмеюць зарабляць грошы. У аграгарадку Жодзішкі Смаргонскага раёна моладзі не надта шмат, але не ўсе з'ехалі ў горад у пошуках лепшай долі. Самаму маладому камбайнеру ў Жодзішках яшчэ няма 25. Ён летась скончыў універсітэт, працуе ў гаспадарцы аграномам па ахове раслін, а падчас жніва садзіцца ў кабіну камбайна.



— У нас моладзь, якая прыйшла пасля ВНУ або каледжаў у аграномію, у заатэхніку, — усе яны працуюць. У асноўным па размеркаванні, але ёсць і тыя, хто застаюцца, — расказвае **дырэктар філіяла «Жодзішкі» УВП «Смаргонскі камбінат хлебапрадуктаў» Андрэй ЯНЮК.** — У самага маладога нашага ветурача ўжо скончылася адпрацоўка, але яна засталася працаваць. Спецыяліст па кормаэнарыхтоўцы два гады адпрацаваў і таксама застаўся...

### У ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ

Работа камбайнера — сезонная. Асноўны заробак — з мая да верасня-кастрычніка. Потым — зацішша, заробак сціплы. У снежністудзені ў трактарыстаў — час працоўных адпачынкаў. Затое ў сезон можна зарабіць некалькі тысяч долараў. Праўда, працаваць часам даводзіцца па 13-15 гадзін у суткі — і нават больш.

***— Ад чаго залежыць заробак камбайнера?***

— Ад колькасці намалочаных тон і, зразумела, ад якасці — тлумачыць дырэктар. — Няякасны намалот сведчыць пра непрафесіяналізм камбайнера, які дрэнна адрэгуляваў свой камбайн.

Розныя культуры ў розные надвор'е патрабуюць розных налад абсталявання. Гэтаму, зразумела, вучаць у каледжах, дзе рыхтуюць трактарыстаў. Але прафесіяналізм, як і ў любой справе, прыходзіць толькі з вопытам. Дарэчы, абслугоўваннем і рамонтам даручанай яму машыны камбайнер займаецца сам — СТА для камбайнаў не прадугледжана.

— Амаль тысячу тон ужо намалаціў, — расказвае **камбайнер Станіслаў ПЛОСКІ.** — Сёлета ўраджай добры. Я ячмень малаціў усю дарогу. Пшаніцы было б болей, там збожжа цяжэйшае. Вядома, і на жыце хутчэй «набіў» бы тысячу.



Але тут, як у войску — на які ўчастак паставіў галоўны агранам, там і «змагайся». Зрэшты, як растлумачыў суразмоўнік, асаблівасці ўбраных культур таксама ўлічваюцца пры налічэнні зарплаты.

***— А адкуль пайшла гэтая традыцыя — камбайнеры-«тысячнікі»?***

— Яшчэ з трыццатых гадоў мінулага стагоддзя, — адказвае дырэктар. — Тады на камбайны за кожную тысячу зорачкі клеілі. З таго часу гэта традыцыя і засталася — «тысячнікі».

***— Як і паняцце «бітва за ўраджай»?***

— Ды якая там бітва!.. Мы не змагаемся, а працуем у штатным рэжыме. Ёсць гады, калі бываюць пытанні па надвор'і, па-рознаму спее адна культура на розных палях, трэба шукаць, куды паехаць убіраць сёння і заўтра. Сёлета з надвор'ем пашанцавала, можна ўбіраць усё запар — любую культуру, акрамя яравой пшаніцы, якая яшчэ не саспела. Што такое сёння ўборка? Прыехаў на поле ў 80 гектараў — і ўбірай сабе. Галоўнае, каб нічога не ламалася і каб былі машыны вывозіць збожжа.

### ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

Камбайн уражвае сваімі памерамі — у кабіну высачэзнай машыны трэба падымацца па даволі доўгай лесвічцы. Кіруецца гэтая махіна джойсцікам. Ёсць дзве педалі — счапленне і тормаз — і каля дзясятка тумблераў справа.

— Тут ўключаем малацілку, тут — жатку, гэта — выгрузка збожжа, — праводзіць для мяне лікбез Станіслаў.

Сёння раніцай ішоў дождж, і на поле камбайны выйдуць крыху пазней — мокрае збожжа добра не вымалаціцца, трэба, каб трохі прасохла. Вопытны камбайнер бачыць поле і адразу ж разумее, якія рэжымы патрэбныя для ўборкі. Часта гэтая прафесія пераходзіць у спадчыну. А яшчэ нярэдка экіпаж камбайна — гэта бацька і сын. У філіяле «Жодзішкі» такіх два.

— Падчас жніва (і збожжаўборкі, і асабліва корманарыхтоўкі) вельмі важны чалавечы фактар, — кажа дырэктар. — Бо гэта працэс творчы, тут патрэбны і талент, і вопыт. Ёсць трактарысты, якім наканавана толькі прычэп за сабой цягаць. Ні ўборку збожжа, ні нарыхтоўку кармоў ім не даверыш. Не тое каб яны п'юць ці не стараюцца — проста не атрымліваецца. А тыя механізатары, якіх можна пасадзіць і на камбайн падчас жніва, і на ўборку кармоў адправіць, і на ворыва, і на жывёлагадоўчыя аб'екты, у любой гаспадарцы — «залаты запас».

Філіял «Жодзішкі» — сыравінная база Смаргонскага камбіната хлебапрадуктаў. Сюды (і на шэраг іншых прадпрыемстваў) па дзяржзаказе паступае збожжа, што вырасла на палях гаспадаркі. Акрамя таго, частка з сабранай тут пшаніцы робіцца вядомая «Лідская мука». Амаль 80 % ураджаю накіроўваецца на вытворчасць камбікармоў (у гаспадарцы — амаль 9 тысяч галоў жывёлы).

### ХАТНЯЯ ГАСПАДАРКА — НА ЖАНОЧЫЯ ПЛЕЧЫ

У аграгарадку Жодзішкі каля тысячы дамоў, сярэдні ўзрост насельніцтва — 45 гадоў. Калі летам мужчыны ад цямна да цямна ў полі, хатняя гаспадарка цалкам перакладваецца на жаночыя плечы.

— Ды якая там гаспадарка! — кажуць мясцовыя жыхары. — Гэта раней па двое-тры каровы мелі, а цяпер мала дзе трымаюць нават адну. Куры, гусі, індыкі, дзе-нідзе свінні ці авечка. Ну, агарод, зразумела, цяпліцы...

Васьмігадзінны рабочы дзень — на ферме або ў сельвыканкаме — таксама ніхто не адмяняў. Як і мыццё, прыборку, гатаванне ежы.



Працягласць філіяла «Жодзішкі» — каля 45 кіламетраў з аднаго канца гаспадаркі ў другі.

— Проста мы так прывыклі, тлумачаць мне. Як гэта — жыць у вёсцы і не паставіць каля дома цяпліцу?

Можна, вядома, і па-іншаму. У апошнія гады ў Жодзішках і навакольлі актыўна скупляюць дамы мінчане — як дачы на лета. Маляўнічая Вілія, чыстыя азёры, хваёвыя лясы... Вялікі горад напружвае, «усё ўключана» — надакучыла, райскія астравы — далёка не кожнаму па кішэні. А тут — чым не востраў? Асабліва калі забрацца далей у лес, дзе нават мабільная сувязь не працуе.

— Іншы раз у такой глушы хаты купляюць! Ім чым далей ад населеных пунктаў, тым цікавей! — расказваюць тут пра прыезджых.



Рабочы дзень камбайнера пачынаецца ў сем гадзін раніцы. А палове восьмай камбайны адпраўляюцца на поле.

Робяць у старэнькім доміку рамонт, а больш заможныя — набываюць зямлю і ставяць новы дом. Травічк пасеялі, арэлькі паставілі і высокім плотам усё гэта абнеслі. У карэнных жыхароў аграгоражджаў даволі ўмоўныя, нізенькія, каб суседкам зручна было перагаворвацца за работай у агародзе. Так што мода на высокія платы выклікае пэўнае незадавальненне. У мясцовых жыхароў усё яшчэ прынята добрасуседства. Вяселлі, праўда, усёй вёскай ужо не святкуюць, і сустракацца людзі сталі радзей у сувязі з пандэміяй. Хоць асаблівай панікі тут не было. Дырэктар расказвае, што і маскі, і дэзынфіцыруючыя сродкі былі закупленыя і раздаваліся работнікам, але людзі карысталіся ўсім гэтым толькі, калі ехалі ў горад.

Лета ў вёсцы — пара, калі ў сутках не хапае яшчэ адной гадзіны.

— Бывае, прыляціш па цемры з работы, а яшчэ дома трэба шмат чаго зрабіць. І робіш дапазна, — дзеліцца Станіслаў. — А назаўтра так спаць хочацца! З іншага боку, жыў бы ў горадзе — што там рабіць? Добра, калі яшчэ свой дом, агародзік, гараж. А калі не? Пасля работы лёг на канапу і піва п'еш? Сумна.

Гендарная роўнасць сюды пакуль не дабралася. Жанчын-«камбайнершаў» няма, і нават такая здагадка выклікае ўсмешку.

— Калі б дзяўчына адвучылася на трактарыста і была талковым спецыялістам — узялі б на работу, чаму б не, — кажа дырэктар.

Але, нягледзячы на магчымасць зарабіць грошы, жанчыны пакуль у гэтую сферу не ідуць.

Выхадных летам у сельскай гаспадарцы не бывае. Адпачынак будзе зімой.

— Зараз пасля камбайна на ворыва пойдзем і амаль да «белых мух», як кажуць, — гаворыць Станіслаў. — А зімой на работу ідзеш гадзін у 9, і ў тры-чатыры гадзіны дня ўжо вольны. Узімку на рамонце ў асноўным стаіш. Зарабляеш з канца вясны да кастрычніка, а потым жывеш на гэтыя грошы.

### АД РАСЫ ДА РАСЫ

Рабочы дзень камбайнера пачынаецца ў 7 гадзін раніцы. Вечарам звычайна людзі стомленыя, неабходныя тэхнічныя работы па штодзённым абслугоўванні камбайна і запраўку паліваў пераносяць на раніцу. У восем, калі няма дажджу, тэхніка ўжо ў полі.

Па полі камбайн рухаецца з хуткасцю 3–5 кіламетраў у гадзіну. Калі пасевы рэдкія — хутчэй. Работа на камбайне патрабуе пастаяннай ўвагі — трэба слухаць матор і глядзець у жатку, каб каласы зразаліся акуратна. Сачыць, каб за камбайнам не заставалася «грыва» (нязжатая паласа), — задача памочніка камбайнера. Калі «грыва» ёсць, у залежнасці ад яе шырыні машына або вяртаецца і зжынае яе, або памочнік робіць гэта ўручную. За дзень адзін прафесійны экіпаж можа ўбраць каля 20 гектараў поля. Можна і 30 гектараў, кажуць камбайнеры, але гэта калі працаваць і ноччу. Аднак па начах убіраюць толькі некаторыя культуры. Часцей камбайны працуюць на палях «ад расы да расы».

Пра нармаваны рабочы дзень у сельскай гаспадарцы ў цёплы сезон гаворка не ідзе. Праца і заробак вымяраюцца не гадзінамі, а тонамі намалоту — колькі зробіш, столькі і атрымаеш. Абед і вячэру камбайнерам прывозяць непасрэдна ў поле са сталоўкі камбіната хлебапрадуктаў. Першае, другое, кампот, булачкі. Гаспадарка аплачвае 80 % кошту харчавання, 20 % вылічваецца з заробку. Па грашах гэта дзесьці ад 60 капеек да рубля. Плаціць за харчаванне камбайнерам падчас жніва цалкам або часткова, кожная гаспадарка вырашае сама: недзе кормяць бясплатна, недзе ўтрымліваюць і 50 % кошту страў.

Калі на полі палегліца, работа ідзе павольней, бо каласы трэба спачатку падняць. Але сёлета моцнай палегліцы няма. У ваколіцах Жодзішак было толькі адно такое поле, і яго ўжо ўбралі.

Працягласць філіяла «Жодзішкі» — каля 45 кіламетраў з аднаго канца гаспадаркі ў другі. Збожжавых да ўборкі — каля 2900 гектараў і яшчэ 400 гектараў рапсу, які ўжо ўбралі. А камбайнаў тут дзесяць. Два новыя, айчынны вытворчасці, былі набыты летась.

***— Не мала машын?***

— Спраўляемся. Яшчэ і суседзям дапамагаем.

Ёсць у гаспадарцы і нямецкія камбайны, і амерыканскі John Deere. Але, як растлумачыў суразмоўнік, тое, што больш дасведчаным камбайнерам дастаецца замежная тэхніка, — не больш чым стэрэатып. Механізатар атрымлівае камбайн і гадоў 10-15 на ім працуе кожны сезон: за гэтыя гады прывыкаеш да сваёй машыны, вывучаеш яе «нораў».

— Калі б прапанавалі перасесці на «амерыканца», я б, напэўна, адмовіўся. Шосты сезон майму камбайну і — цьфу-цьфу, не прагаварыцца — сур'ёзных паломак не было. Па дробязях — зразумела. Выпраўляю сам. Сам рамантуеш — сам беражэш.

***— Цікава працаваць на камбайне?***

— Цікава. А можа быць, проста звычка. Працаваць жа дзесьці трэба. І мая работа мне, у прынцыпе, падабаецца, — паціскае плячыма Станіслаў.

Амаль тое ж пытанне — за што любіце сваю работу? — задаю і дырэктару філіяла «Жодзішкі».

— Напэўна, за тое, што ў сельскай гаспадарцы можна ўбачыць вынік сваёй працы, — кажа Андрэй Янюк. — Сёння пасеяў — неўзабаве ўзышло. Калі ўсё зроблена правільна ды надвор'е не падвяло — будзе ўраджай. Тое ж самае і ў жывёлагадоўлі: хтосьці доіць па 7 літраў на карову, а хтосьці — 22 літры, як наша гаспадарка. Колькі працы ўклаў, такі вынік і атрымаў. Мне здаецца, магчымасць убачыць рэальны вынік сваёй працы — гэта вельмі важна для кожнага. Гэта матывуе і надае жыццю сэнс.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## Отчет эмитента ценных бумаг за 2-й квартал 2020 года

# ООО «Темпл Сити»

220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, ком. 7, УНП 192280260.
Вид экономической деятельности:
сдача внаем собственного и арендуемого имущества.
Единица измерения: тыс. руб.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2020 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 30 июня 2020 года | На 31 декабря 2019 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 7 495 | 7 571 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 13 | 13 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 16 | 15 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 4 | 4 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **7 529** | **7 603** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 13 | 13 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 13 | 13 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 133 | 87 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 171 | 341 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 18 | 13 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **335** | **454** |
| **БАЛАНС** | **300** | **7 864** | **8 057** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 30 июня 2020 года | На 31 декабря 2019 года |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 874 | 3 383 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | | (1 509) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | (349) | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 525** | **1 874** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 4 849 | 4 420 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 912 | 1 245 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **5 761** | **5 665** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 516 | 446 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 62 | 72 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 3 | 8 |
| по авансам полученным | 632 | 8 | 13 |
| по налогам и сборам | 633 | 15 | 14 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 1 |
| по оплате труда | 635 | 2 | 2 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 33 | 34 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **578** | **518** |
| **БАЛАНС** | **700** | **7 864** | **8 057** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – июнь 2020 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–июнь 2020 года | За январь–июнь 2019 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 576 | 517 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | - |
| Валовая прибыль | 030 | 576 | 517 |
| Управленческие расходы | 040 | (219) | (182) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 357 | 335 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 397 | 4 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (230) | (9) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 524 | 330 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 | 6 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 1 | 2 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | 4 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | (7) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | (7) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 495 | 281 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 495 | 281 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 369) | (151) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (152) | (143) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (1 216) | (2) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (1) | (6) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (873) | 129 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (349) | 459 |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (349) | 459 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (349) | 459 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## 7 сентября 2020 года в 10.00 по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков и на право частной собственности

**Организатор аукциона – Узденский районный исполнительный комитет**

На аукционные торги для заключения договоров аренды выставляются участки

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публикацию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Узденский р-н, Слободской с/с, в районе д. Калининск | 0,5400 | 625683200004000010 | 519,75 | 51,98 | 3597,45 | Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт, в придорожной полосе автомобильной дороги |
| 2 | Минская обл., г. Узда, ул. К. Маркса | 0,3054 | 625650100003001706 | 5703,35 | 570,34 | 2480,25 | Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт; охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения; в охранных зонах объектов газораспределительной системы |

Целевое назначение участка № 1 – для строительства и обслуживания производственно-складского объекта с подъездной дорогой (для размещения объектов обрабатывающей промышленности, код 1 11 02). Имеется возможность подключения к центральному электроснабжению. Срок аренды – 50 лет. Целевое назначение участка № 2 – для строительства и обслуживания станции технического обслуживания автомобилей (для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей, код 1 16 04). Имеется возможность подключения ко всем необходимым инженерным сетям.

На аукционные торги по продаже земельных участков в частную собственность для ведения коллективного садоводства выставляются участки

| № лота | Местонахождение участка | Площадь S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма возмещения затрат на оформление и регистрацию участка, (кроме расх. на публ-цию извещ.) | Ограничения (обременения) в использовании |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Жилищник», уч. № 80 | 0,1012 | 625684200004000120 | 1400,00 | 140,00 | 1441,31 | Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт |
| 2 | Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Ангел», уч. № 241 | 0,1001 | 625680800002000137 | 1110,00 | 111,00 | - | - |

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (либо через своего представителя или уполномоченное лицо) предъявляет:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 54705).

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

После получения необходимых документов от гражданина, индивидуального предпринимателя и юридического лица на участие в аукционе комиссия или организация выдает ему билет участника аукциона, который перед началом аукциона необходимо обменять на аукционный номер.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 405, по рабочим дням с 6 августа по 1 сентября 2020 г. включительно с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.**

Аукцион состоится по лоту при наличии двух или более участников аукциона.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY18AKBB36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области, г. Минск, ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код банка AKBBBY2X, код платежа – 04002 (плата за право заключения договоров аренды земельных участков), платежным поручением (квитанцией) с пометкой «Задаток за земельный участок».

Заключительная регистрация – с 9.00 до 9.50 в день проведения аукциона.

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по телефонам: 8 (01718) 65404, 54705.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.gov.by** либо по адресу: **г. Узда, ул. Советская, 22, каб. 405 и по телефону 8 (01718) 54705.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 04.09.2020 г. в 10.30**
**по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4-й этаж, актовый зал**

## Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Гродненского филиала РУП «Белпочта», находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29

**На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества.**

Лот № 1. Помещения на 2-м этаже площадью 94,1 (20,0; 72,6; 1,5) кв. м, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Максима Горького, 24–38, изолированное помещение, отделение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 397 руб. 57 коп., размер задатка – 39 руб. 76 коп., целевое использование – размещение офисов, под производственные цели (за исключением вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения;

Лот № 2. Помещения на 1-м этаже площадью 49,5 (14,8; 3,8; 27,0; 2,2; 1,7) кв. м, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Калиновского, 75–2, изолированное помещение, помещение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 209 руб. 14 коп., размер задатка – 20 руб. 91 коп., целевое использование – размещение офисов, под производственные цели (за исключением вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения;

Лот № 3. Помещения на 2-м этаже площадью 86,5 (1,7; 1,0; 83,8) кв. м, расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Калиновского, 75–2, изолированное помещение, помещение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 365 руб. 46 коп., размер задатка – 36 руб. 55 коп., целевое использование – размещение офисов, под производственные цели (за исключением вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения.

Арендная плата устанавливается в соответствии с Положением о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 года № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» (далее – Положение). При установлении коэффициента от 0,5 до 3,0 включительно, определенного п. 8.2 Положения, при расчете арендной платы применяется коэффициент в размере 3,0.

Документы на участие в аукционе принимаются с 05.08.2020 г. по 03.09.2020 г. в рабочее время (с 8.30 до 17.15 по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 3-м этаже, каб. 302, документы, поданные после 16.00 03.09.2020 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на р/с BY42AKBB30120000600064000000, ГОУ № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 500826554, Гродненский филиал РУП «Белпочта»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации, документ, удостоверяющий личность;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

В случаях, если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 20 базовых величин.

Договор аренды по результатам проведения аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Телефон для справок: 8 (0152) 68-59-96, факс 8 (0152) 72-31-23**

# «ЛЁГКІ» СРОДАК — ЗРАЗУМЕЦЬ

## ЛЁС ГРУШЫ

У самым кутку школьнага двара расла груша. Высокая, з шырокай кронай і моцным ствалом. А яшчэ — з невялікімі, але смачнымі пладамі. Аднойчы і я пакаштаваў іх. Праходзіў якраз побач, убачыў у траве некалькі паданцаў, прынёс дадому і паклаў на падаконнік: хай трошкі даспеюць, цвердаватыя пакуль. Пачакаў колькі дзён, а потым пакаштваў. Смаката! Дзіўна што тая груша так вабіла да сябе хлапчукоў! Хто-хто, а яны толк ведаюць у гэтай справе. Сваё, як кажуць, не ўпусцяць. Вядома ж, грушы дайсці як належыць не паспявалі, але дзятва грызла іх так, што насы ўпрысядкі хадзілі. Хто ж будзе чакаць, пакуль



плады даспеюць? Няма калі. Нам і так добрыя будуць. А то ж ці ўцалеюць яны хіба да заўтрага? Вунь колькі ў раёне ласых! Не спазніцца б!..

Як жа так атрымалася, што на школьным двары аказалася груша? Некалі яна расла на агародзе, вядома ж, мела свайго гаспадара, а калі дом зносілі, дрэва рашылі не вытралёўваць. Тым больш што праекціроўшчыкам яно не замінала. Хай расце і радуе людзей сакавітымі пладамі!

Сёння двор абнесены металічнай агароджай, а на тым месцы, дзе гадоў сорак таму стаялі прыватныя хаты, пабудавалі шыкоўную школу. Распраўляў плечы мікрараён камбайнабудаўнікоў, ішла якраз і Усесаюзная камсамольская будоўля на прадпрыемстве, таму ў Гомель прыязджала моладзь з многіх куткоў СССР. А дзе моладзь — там і вяселлі, а дзе вяселлі — там і дзеці. Будаваліся дзіцячыя садкі, новыя школы. Ну, вядома ж, і жыллё.

Усё гэта праходзіла на маіх вачах. З акна кватэры, дзе сёння жыву, бачу садзік і край школьнага двара. А калі з дрэў асыплецца долу лісце, то і саму школу.

Цудоўны раён, ціхі, негаманкі. Зялёны. Некалькі вадаёмаў. Мне падабаецца.

А тут іду нядаўна каля школьнага двара, і — адчуваю — нешта не тое навакол. Спыніўся, прыгледзеўся, ацаніў. Ага, вось у чым справа — грушу спілавалі! Няма грушы! Здзівіўся: і каму яна перашкаджала? Мо, не адзін я так падумаў. А потым паразважаў над лёсам гэтай пладавітай грушы, і, ведаеце, быў ужо не такім катэгарычным, як раней. А што, калі б я сам быў дырэктарам школы і з акна (ды і не толькі з акна!) бачыў, як дзятва лазіць па дрэве — нават калі на ім і пладоў няма. Як бы глядзеў на ўсё гэта? Спакойна? Раўнадушна? Наўрад. Тут калі сваіх дзяцей выпадкова заўважаў на дрэвах у вёсцы — у пятках калола. Так што, каб не мець лішніх клопатаў, аддаў бы, мусіць, і я каманду спілаваць дрэва, папярэдне папрасіўшы ў яго прабачэння. Жыццё і здароўе дзіцяці даражэйшыя. Ды і з каго спагоняць, калі што здарыцца? Вядома, з каго — з дырэктара. Хоць магло б і нічога не здарыцца. Аднак падстрахавацца ніколі не будзе лішнім. Вартаўніка ж да грушы не прыставіш.

Не ведаю, як было на самай справе, а мне чамусьці ўявілася, што ўсё склалася менавіта так.

Лёс дрэва, як і лёс чалавека, залежыць іншы раз ад чыстай выпадковасці.

У свой час грушу пасадзілі не на тым месцы...

## ХІТРУН

Хоць я не заядлы рыбак, але іншы раз выбіраюся з сынамі на якое-небудзь возера альбо на Сож ці Дняпро. З вудамі. Малодшы на ўсялякі выпадак перад адпраўкай на рыбалку прапаноўвае часам набыць рыбу ў краме. Каб без юшкі не застацца. Жартуе. Хоць у жарце ёсць і доля праўды... Але ж не толькі па рыбу едзем на бераг вадаёма, зусім не, — больш каб адпачыць, унесці ў жыццё нейкія новыя штрышкі.

Апошні раз пашэнціла. Узялі трох ладных лінёў і двух амаль такіх жа ляшчоў. Юшка атрымалася. Яшчэ прывезлі ў горад тым, хто скептычна адносіцца да нашага захаплення: частуйцеся, няверы!..

Пакуль сядзелі на беразе, назіралі і за рыбаком, які аблюбаваў сабе месца насупраць. Да яго было метраў сто пяцьдзясят, таму добра бачылі, як ён раз-пораз выцягваў рыбку і складваў у садок. Якраз да нас падышоў мужчына, які рыбаліў непадалёк, запыхкаў дымком і кіўнуў, бы між іншым, на таго рыбака, што вудзіў на другім беразе.

— Звярніце ўвагу на гэтага мужыка, — заўважыў ён з непрыхаваным дакорам у голасе. — Вудзіць рыбу на гэтым мосціку, а скрэбці пойдзе на другі такі ж. Заляпае луской усе дошкі. Чаму так робіць, не здагадваецеся?

— Не-а.

— І не здагадаецеся! Бо ён хітрун яшчэ той! Адзін раз я таксама купіўся. Падыходжу да першага мастка, бачу, усё ў лусцы. Ну, думаю, месца рыбнае. Закідваю вуды — не клюе. Нуль увагі на мае насадкі. І чарвякоў на кручкі нанізваю, і зярняты кіёвак, і апарышы, і воблеры скарыстоўваю... Час толькі страціў, стаміўся і амаль нічога не ўзяў. Мо, кату толькі паласавацца... А потым я дапяў усё ж, раскусіў таго мужчыну. Сваім манеўрам ён адводзіць сапернікаў ад рыбнай мясцінкі. Ловіць у адным месцы, а чысціць рыбу зусім у іншым. Спадзяюся, усё зразумелі?

Мы кіўнулі. А мужчына на адыходак паведаміў, што калі прыціснуў таго рыбака да сценкі, вобразна кажучы, той і сам прызнаўся ва ўсім: «Гэта мой ход такі. А што тут не так? Якія могуць быць прэтэнзіі? Грыбныя ж мясціны вы не выдаяце абы-каму. А чаму рыбныя можна? Калі рыба клюе на чарвяка, то рыбак — на луску. А, як? Бывае і такое».

Захацелася калі-небудзь апярэдзіць усё ж таго рыбака ды палавіць на аблюбаваным ім месцы.

А паскрэбці рыбу мы і дома паскрабём. Было б што.

## ПЕРШЫ БЛІН

Шмат гадоў таму некаторыя гомельскія журналісты і вядомыя ў вузкіх колах літаратары любілі іншы раз сабрацца разам пасля працоўнага дня за куфлем піва. Нічога дзіўнага. Некалі і мы, як кажуць, былі рысакамі. Часцей за ўсё такія сустрэчы ладзіліся ў Навабеліцы паблізу раённай газеты «Маяк». Не ленаваліся ж нават з цэнтра горада ехаць! Значыць, там было творчым людзям добра, утульна. Ды і ад вачэй начальства далей. А пагамоніць ім было аб чым! Менавіта падчас адной такой сустрэчы Леанід Гаўрылкін, тады яшчэ мала каму вядомы празаік і ў будучым мінчук, параіў Івану Сяркову, які артыстычна апавядаў пра свае дзіцячыя прыгоды ў час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі ягонай вёскі Пакалюбічы, напісаць пра гэта літаратурныя творы. І што? Іван Кірэевіч паслухаўся і стварыў тры цудоўныя аповесці: «Мы з Санькам у тыле ворага», «Мы — хлопцы жывучыя» і «Мы з Санькам — артылерысты», якія будуць цёпла сустрэты чытачамі і адзначаны шматлікімі літаратурнымі прэміямі ў Маскве і Мінску.

Сёння і журналістыка іншая, і журналісты, вядома ж, не такога разліву. У іх наўрад ці існуе сваё месца сустрэчы. Чамусьці больш перакананы, што «сустракаюцца» адзін з другім яны, трымаючы каля вуха ці перад сабой смартфон або кляцаючы па кнопках кампю'тара.

Пра сваё першае прафесійнае заданне, якое праваліў, распавёў мне вядомы ў Гомелі журналіст Сяргей Краснабарод. Зразумела, не каля газеты «Маяк». Ён сядзеў у сябе дома, а я — у сябе.

— Першае журналісцкае заданне я праваліў начыста. Хочаш паслухаць, як было? Ёсць час?

— Гамані.

— Ахвотна. Я — сямнаццацігадовы малец, які тры месяцы таму яшчэ цягаў школьную торбу з падручнікамі. Наіўны рамантык з нататнікам, поўным нязграбных вершыкаў уласнага складання. Але я сур'ёзна марыў пра журналістыку. Таму і апынуўся ў галіновай штотыднёвай шматтыражнай газеце. Мяне ўзялі з выпрабавальным тэрмінам.

У будаўнічым аб'яднанні якраз рыхтаваліся адзначаць круглую дату — ці то трыццаць, ці то трыццаць пяць гадоў з моманту яго стварэння. Даведаліся, што жывы яшчэ першы дырэктар будтрэста. Знайшлі адрас. Мне даручылі напісаць душэўнае інтэрв'ю з ім, расказаць і пра гераічныя подзвігі



будаўнікоў. Плюс узяць у яго пару фатаграфій той эпохі з хатняга архіва, калі дадуць на вынас.

Напярэдадні патэлефанаваў — растлумачыў, хто я і што мне трэба.

Іду. Знаходжу дыхтоўны цагляны дом у цэнтры горада. Зусім недалёка ад рэдакцыі. Чатыры паверхі. Шырокі лесвічны пралёт. Сцены пафарбаваны бэжавай алейнай фарбай. Высокая пабеленая столь. Кватэра на першым паверсе. Адчыняе добразычлівая бабулька. Сівыя валасы. Чысты пагляд блакітных вачэй. Дзяжурныя прывітанні. Гучна кліча мужа.

Заходзім у прасторны пакой з вялікімі вокнамі. На сценах — традыцыйныя пейзажы алеем на палотнах у разьбяных рамах, дзе-нідзе фатаграфіі. Статуэткі на паліцах за шклом шафы перад роўнымі радамі кніг. Вялікая канапа. Масіўныя крэслы ў тон. На часопісным століку — некалькі фотаальбомаў, штук пяць-шэсць, рознакаляровыя, цьмяныя, фарматам больш стандартнага ліста. Мяне, здагадваюся, чакалі.

З суседняга прахаднога пакоя паміж двухстворкавымі дзвярамі ў абрамленні цяжкіх аксамітных фіранак з'яўляецца стары. Высокі, худы, згорблены, лысы. Твар і галава ў карычневых пігментных плямах. Белая кашуля запраўлена ў новенькія сінія спартыўныя порткі з лампасамі. Шырокі кароткі гальштук на гумцы. Шорхаючы тэпцікамі, гаспадар кватэры дабіраецца да другога крэсла каля часопіснага століка, працягвае руку для прывітання, садзіцца на край. Выцвілыя вочы глядзяць спалохана і сумна, слязяцца.

Гаспадыня, як я потым зразумеў, пайшла на кухню гатаваць чай. Першыя хвіліны нашай размовы. Спрабую знайсці патрэбную інтанацыю і паралельна ўціхамірыць усярэдзіне сябе малайцаватую энергію неафіта, якая б'е праз край. І пакуль кажу штосьці дзяжурнае і правільнае, ён моўчкі глядзіць. Глядзіць мне нават не ў вочы, а як быццам скрозь іх, кудысьці далей, глыбей... Потым гэтак жа, не прамовіўшы ні слова, бярэ са стала верхні фотаальбом. Адкрывае наўздагад. На ўсю старонку — «Ганаровая грамата». Мне, бо сяджу насупраць, не разабраць тэксту, але малюнкі кумачовых сцягоў бачны добра, як і партрэты Леніна і Сталіна. Худая кашчавая рука накрывае глянцавы ліст граматы і ледзьве слізгае па ім — быццам гладзіць. Стары паднімае галаву. У вачах поўна вільгаці. Ён глядзіць на мяне і бязгучна плача. Слязінка ўпала на руку, якая пакрывае кумачовыя сцягі...

І я губляюся. Я не ведаю, што рабіць, як сябе паводзіць далей, што казаць, аб чым пытацца. Становіцца няўтульна — як быццам падглядаю ў замочную шчылінку... Становіцца сорамна — за дакучлівае ўварванне ў чужое жыццё, за бесталковую журналісцкую рызыку, за сваю маладосць...

У пакоі з'яўляецца яго жонка з кубкамі чаю на падносе:

— Вам лепш сысці. Гутаркі не атрымаецца. Вы ж самі ўсё бачыце...

І я рэціруюся. Вывальваюся з пад'езда на вуліцу...

Гадзіны праз паўтары дакладваў рэдактарцы пра свой візіт да першага дырэктара нашага будаўнічага аб'яднання. Яна толькі ківала галавой. Як быццам загадзя ведала, чым гэта ўсё павінна было скончыцца...

А ў горадзе раскашавала тады лета 1982 года...

І ўсё ж я, калі акрэп як журналіст, пра гэтага чалавека напісаў добры артыкул. Праўда, ужо са слоў тых, хто яго ведаў. Дарэчы, у нас, журналістаў, ёсць адзін лёгкі сродак — зразумець. Зразумець сябе і свайго героя...

Вось што пачуў я ад Сяргея.

Ад сябе дабаўлю: і хоць той першы блін атрымаўся камяком, Сяргей Краснабарод і па сённяшні дзень працуе ў Гомельскім тэлерадыёаб'яднанні. Лічыцца там сярод карыфеяў.

**Васіль ТКАЧОЎ.**

Выстаўка

# ПАПРАСАВАЎ І Ў... КІШЭНЮ

**У віцебскім Музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання можна ўбачыць больш за 150 прасаў, зробленых у розныя стагоддзі ў розных краінах. Збор прадастаўлены калекцыянеркай Юліяй Ржэўскай.**

Напрыклад, вугальныя прасы, вынайдзеныя ў XVIII стагоддзі. Каб яны як мага даўжэй былі гарачыя, унутр загружалі гарачае вуголле. Цікава, што нашы продкі, калі не выкарыстоўвалі гэтую прыладу, рабілі з яе пастку для грызуноў. Вугальнымі прасамі, дарэчы, карыстаюцца і ў наш час.

Пэўны перыяд XIX стагоддзя выкарыстоўвалі газавыя прасы, якія далучаліся пры дапамозе металічных трубачак да газавых балонаў. Аднак з іх з'яўленнем пачасціліся выпадкі ўцечкі газу, і як вынік — пажары.

На выстаўцы можна ўбачыць і жароўню XIX стагоддзя — вельмі «кантрасны» ў параўнанні з вугальным прасам экспанат. Справа ў тым, што прыкладна такімі ж каля 4000 гадоў таму ў Кітаі каталі. У коўш засыпалі нагрэтыя пясок, камяні, вугаль, і... Пазней кітайская прамысловасць перайшла на выраб жароўняў у выключна мірных мэтах.

Паказана тут і драўляная канструкцыя — прылада, зробленая таксама прыблізна ў пазамінулым стагоддзі з рыфленай дошкі і каталкі. Такімі карысталіся і ў Беларусі.

У пачатку XX стагоддзя прыдумалі спіртавы прас. Але з-за высокага кошту — прыбор каштаваў каля пяці рублёў, прыкладна столькі ж, колькі карова — ён быў цяжкадаступны для набыцця небагатымі людзьмі. Заможнымі жаніхамі і нявестамі лічыліся тыя, у каго ў сям'і быў такі прас.

Першы электрычны прас з'явіўся ў ЗША. Яго запатэнтаваў Генры Сілі 6 чэрвеня 1882 года. З тых часоў такія прылады ўдасканаліліся і трывала ўвайшлі ў наша жыццё.

Сярод электрычных, якія можна ўбачыць у Віцебску, ёсць і невялічкія, якія лёгка можна схаваць нават у кішэні. Гэтыя міні-прыборы выраблялі спецыяльна для таго, каб іх можна было ўзяць з сабой у паездку.

Здзіўляюць сваім выглядам прыстасаванні для прасавання гальштукаў, жаночага адзення, зробленага з вельмі «капрызных» тканін, для навядзення стрэлак на штанах...

Кожны экспанат — часцінка эпохі, у якую бытавыя прадметы выкарыстоўваліся.

**Барыс ВАСІЛЬЕЎ, дырэктар прадпрыемства «Мінскгардаведка»**, якое арганізавала выстаўку, дарэчы, сам калекцыянер прасаў. У яго іх сотні! Самы рарытэтны зроблены ў XVIII стагоддзі. Падчас замежных камандзіровак дырэктар заўсёды стараецца прывезці ў Беларусь стары прас. Купляе будучыя экспанаты і на аўкцыёнах. Калекцыянер адзначыў, што такія выстаўкі ладзяцца, каб людзі часцей наведвалі музеі. Прадпрыемства некалькі гадоў актыўна развівае турызм у межах Беларусі і робіць стаўку на музейны кірунак. А тыя, у каго ёсць «Картка госця», якую прапагандуюць у «Мінскгардаведцы», могуць эканоміць пры пакупцы білетаў для наведвання каля двухсот музеяў, а таксама ў крамах і кавярнях.

Адкрытая з месяц таму выстаўка «Музей праса» стала папулярнай сярод гараджан і турыстаў — яе можна ўбачыць да 1 лістапада.





**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Новы фармат

# АД ТУСОЎКІ ФАНАТАЎ ДА МІЖНАРОДНАГА СВЯТА

## Як у Гродне прайшоў IX фестываль вулічнага мастацтва

**Сёлета яскравага і вясёлага шэсця, як было раней, не атрымалася. Але каманда арганізатараў не адмовілася ад правядзення фэсту, а перанесла яго ў анлайн-фармат. Трансляцыя вялася з імправізаванай пляцоўкі на беразе Нёмана. Разам з тым да гродзенцаў, якія на ёй выступалі, далучыліся беларускія і замежныя артысты ў відэафармаце.**



Біг-міні-фестываль без перабольшання можна назваць адным з брэндаў горада. І хоць свята значна маладзейшае і не такое маштабнае, як вядомы Фестываль нацыянальных культур, гэтая падзея становіцца значнай у гарадскім асяроддзі. Традыцыйна ў канцы ліпеня пешаходная вуліца гістарычнага цэнтра запаўняецца вясёлым натоўпам. Адно толькі шэсце чаго варта! Тут і музыканты, і цыркачы, і артысты арыгінальных жанраў, і жывыя скульптуры. На леташні фестываль сабралася амаль 300 удзельнікаў з шасці краін свету. А заявак было атрымана ўдвая больш.

Сёлета ўся праграма сышла ў інтэрнэт. Трансляцыя вялася больш за тры гадзіны. І хоць аўдыторыя ў асноўным была віртуальная, гродзенскія артысты выступалі на сцэне — на пляцоўцы каля Нёмана. Тут жа вядучыя шоу коратка знаёмілі з удзельнікамі фестывалю. Раз-пораз арганізатары выходзілі на сувязь з іншымі гарадамі Беларусі, а таксама замежнымі артыстамі.

Фестываль такога фармату аказаўся першым вопытам, але арганізатары бачаць у гэтым і свае плюсы: па-першае, магчымасць пашырыць аўдыторыю, а па-другое, шанц зацікавіць замежных артыстаў да ўдзелу ў наступным, юбілейным фэсце вулічнага мастацтва.

Менавіта на гэта скіроўвала сваіх віртуальных суразмоўнікаў арганізатар фестывалю Настасся Роўба. Яна адзначыла, што падрыхтоўка да яго ўжо хутка і ўжо зараз можна дасылаць свае пажаданні і заяўляць пра ўдзел.

Вядома, вулічнае мастацтва — гэта ў значнай ступені музыканты. Самая юная ўдзельніца Ева Венская прадэманстравала ігру на некалькіх музычных інструментах — флейце, трубе, саксафоне. Яна неаднойчы выступала на Біг-міні-фестывалі, а таксама ўдзельнічала ў міжнародных конкурсах. А вось квартэт саксафаністаў з Гродна — калектыў унікальны. Яго кіраўнік Сяргей кажа, што гэта першы ў горадзе такога роду вулічны калектыў. Яны сапраўды выйшлі на вуліцу, бо апошнія паўгода былі пазбаўлены гледачоў, не маглі сябе творча рэалізаваць з-за адсутнасці канцэртаў і конкурсаў. Таму музыканты вырашылі іграць на вуліцах, дзе і былі знойдзены арганізатарамі фестывалю. Можна тут іншым разам сустрэць і музыканта Аляксандра Зіміна, які жартам называе свой інструмент «лятаючая талерка». На самай справе гэта хэндпан — металічны барабан, гісторыя якога не налічвае нават двух дзесяцігоддзяў. Між тым інструмент збірае нямала прыхільнікаў як сярод музыкантаў, так і сярод слухачоў.

Вядома, вулічнае мастацтва — гэта не толькі музыканты. Праграму фестывалю значна ўзбагацілі выступленні тэатральных калектываў. Напрыклад, малады тэатр «Гродзенская надзея» мовай пантамімы расказаў пра тое, чаму важна не быць залежным ад мабільнікаў, а больш сустракацца і размаўляць асабіста. Яскравае відовішча паказаў гродзенскі калектыў чэрлідараў «Дартлі». Сваю праграму прадставіла «Свабодная студыя» — цікавая творчая прастора, якая праводзіць канцэрты, адукацыйныя лекцыі і семінары, танцавальныя конкурсы, фотасесіі і многае іншае.

Вялікую праграму прэзентаваў гродзенскі фрык-тэатр «Гіксаген». Яго кіраўнік Васіль Калач растлумачыў, што вулічны тэатр, якому пяць гадоў, любіць дэманстраваць гледачам нестандартныя нумары — напрыклад, піракія або фехтавальныя.

Анлайн-фестываль даў магчымасць пераадолець межы і ўбачыць вулічнае мастацтва іншых краін. Напрыклад, тэатр «Сола» з Санкт-Пецярбургу рыхтуе праграму, у аснове якой карнавальнае шэсце. Гэта цэлы спектакль, прэм'ера якога адбудзецца толькі ў жніўні. Магчыма, новую праграму расійскія артысты прывязуць на гродзенскі фестываль налета. Падчас відэасувязі ўдзельніца калектыву расказала, як хочацца выступаць перад жывой аўдыторыяй, і пажадала, каб свет прачнуўся пасля пандэміі з жаданнем новых сустрэч і фестываляў.

У анлайн-фармаце выступіў калектыў з Мінска «Варгін». Удзельнікі растлумачылі, што Варгін — гэта таямнічы кароль катоў у міфалогіі беларусаў. Студыя аб'ядноўвае людзей, якія апантаны любоўю да беларускай культуры, яе традыцый і спадчыны. У рэпертуары можна знайсці спектаклі, перфомансы, майстар-класы і музычныя праграмы для дзяцей і дарослых. На гродзенскім фестывалі прагучала палеская вясельная песня ў апрацоўцы музыкантаў.

Дзякуючы сецыву прыхільнікі фестывалю змаглі ўбачыць выступленні паветранай гімнасткі з Ірландыі, а таксама эстонскую танцорку з агню.

Трэба сказаць, што вулічнае мастацтва набывае даволі відавочны «вогненны» акцэнт. Прыхільнікаў падобных шоу становіцца ўсё больш. Вось і на фестывалі ў Гродне сваё майстэрства прадэманстравалі Сняжана і Уладзімір з Віцебска. «Вогненным» мастацтвам яны займаюцца восем гадоў і часта выступаюць на публіцы. Вогненна-музычнае шоу на тэму аповесці Гогаля "Вечары на хутары паблізу Дзіканькі" прадставіў анлайн-калектыў з украінскага горада Чарнаўцы. Дзяўчаты-ўдзельніцы расказалі, што рыхтавалася праграма паўгода. Калі будзе магчымасць, яны налета мяркуюць паказаць яе і ў Гродне на юбілейным X фестывалі.

А завяршыўся сёлетні фестываль феерычным выступленнем вядомага гродзенскага тэатра агню «Эрга Бібамус». Нумар уразіў і эфектам вогненнага дажджу, і доўгай вогненнай спіраллю, якая нагадвала ДНК. Тэатр, што называецца, паставіў яскравую кропку. Дарэчы, агенцтва «Бібам» разам з цэнтрам культуры «Гродна» і гарвыканкамам уваходзіць у лік арганізатараў Біг-міні-фестывалю, дэвіз якога — «Да мастацтва — скрозь рамкі».

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Год малой радзімы

# СОМІНА — ЯК ПЕРШАЕ КАХАННЕ

**...Могілкі ў гэтай вёсцы — чысценькія, прыбраныя — знаходзяцца ў цэнтры. На іх (клопат энтузіястаў) ужо выбрана месца і прывезены гравій для будучай капліцы. Там жа, на кладах, на адным з помнікаў — шчыры кранальны надпіс: «Любіце Соміна, як я любіў».**

І сапраўды, у гэтай вёсцы жыве свайго роду дух спаборніцтва: маўляў, я для свайго Соміна ўсё зраблю... А я — дык і яшчэ болей! Прычым стараюцца вось так, адзін перад адным, найперш тыя, хто нарадзіўся тут і вырас, хто, як кажуць, стаў на крыло. Летась, напрыклад, яны «вярнуліся», каб разам з мясцовымі жыхарамі раскарчаваць пляжную пляцоўку, злучыць яе з тэрыторыяй мясцовага сельскага клуба. Таму сёлета святу вёскі было вельмі раздольна — як, мусіць, нідзе.

І фармат быў новы. Фэст «Сомінская юшка» стаў прызнаннем у любові найперш да возера, на берагах якога вырасла так шмат заўзятых рыбакоў. Яны — і людзі сталыя, і каманда, можна сказаць, малых, пачаткоўцаў — спаборнічалі не толькі ў тым, хто больш наловіць рыбы, але і ў тым, хто найлепш «распарадзіцца» гэтым уловам — зварыць смачнейшай юшкі. Адшукае, напрыклад, старажытны рэцэпт, дадасць ёй «прыправы» ўдалай назвай, адпаведным афармленнем пляцоўкі з вогнішчам, замовіць майкі з назвай каманды, пачастуе ўдадатак грачанай кашай...

Парадавала гледачоў і канцэртная праграма: выступленні ансамбля «Сяброўкі», салістаў Івацэвіцкага ГДК, мясцовых знакамітасцяў...

Сярод такіх быў і «хлопчык» Сашка (яго маці адна гадавала шасцёра дзяцей — бацька рана памёр...),







які некалі не меў нават добрага абутку, а цяпер купіў сабе ці не самы круты матацыкл і на свяце разам з сябрамі правёў парад байкераў... Прычым не проста, каб пакрасавацца, а прадоўжыць збор сродкаў на лячэнне хворай дзяўчынкі Сафіі.

Гэтую ж скарбонку хацелі папоўніць і мясцовыя жанчыны, гаспадары аграсядзібы «Мядовыя канікулы». Іх клопатам на свяце прадавалася свежая выпечка, сокі, глазураваныя пернікі з надпісам «Соміна». Для дзятвы тут можна было купіць цацкі і ўпрыгожанні, зробленыя рукамі майстроў. А пакуль дарослыя ацэньвалі смак юшак, працаваў батут, аніматар праводзіў гульні...

Быў на свяце і яшчэ адзін парад — машын, якія штогод удзельнічаюць у «Трофі-рэйдзе» да Дня Перамогі. Дарэчы, у апошнія гады ў пераможцы міжнароднага спаборніцтва выходзілі менавіта сомінцы, якія па балотах умеюць не толькі гойсаць, але сканструяваць для гэтага свае аўто, што і зрабілі браты Салонкі...

У свят вёскі былі, ёсць і, дасць бог, будуць пастаянныя спонсары — выхадцы з Соміна. Іх прозвішчы — Капыцічы, Куцкі, Абрамчукі, Кармановічы... То-бок, самыя распаўсюджаныя,



вясковыя, дзе носьбіты іх даводзяцца адзін аднаму то дзядзькамі, то братамі, то сватамі, то блізкімі сябрамі... На Новы год і Каляды яны прывозяць усім тутэйшым дзецям падарункі, частуюць адзінокіх, шматдзетных і проста жыхароў сталага ўзросту. Яны шануюць гісторыю вёскі, паклапаціліся, каб з суседнімі ёе злучала добрая асфальтаваная дарога, каб тут быў газ. Адных аграсядзіб у Соміне, вёсцы, дзе жыве сотні паўтары чалавек, цэлых тры і кожная — у сваім непаўторным стылі...

Вось і гэтым разам спонсары падумалі пра сюрпрыз: свята завяршыў двуххвілінны салют і дыскатэка пад зорным небам. Бо як жа яшчэ, калі Соміна, кажуць — як першае каханне: адно і ўжо назаўсёды.

**Валянціна БОБРЫК.**
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.**

Дзякуй!

## Жывуць такія хлопцы...

**Дэсантнікі Смаргонскага раёна ў дзень ветэрана-дэсантных войскаў (гэта ўжо традыцыя) наведаліся ў дзіцячы прытулак сацыяльна-педагагічнага цэнтра.**

Выхаванцы яго, ну вядома ж, чакалі гасцей, загадзя разам з выхавацелямі падрыхтавалі віншаванні і паштоўкі.

З падарункамі, салодкім пачастункам і клоўнам Клёпам прыйшлі і «блакітныя берэты», адбылося сапраўднае свята, пасля якога дзецям, зразумела ж, не трэба казаць (бо яны ўжо ведаюць), што дэсантнік — гэта чалавек, які заўсёды знаходзіцца ў патрэбны час у патрэбным месцы, які дапамажа...

А таму — шчырая ўдзячнасць усім, хто прычыніўся да гэтага мерапрыемства.

**Ларыса ТАТАРЫНАВА,**
**дырэктар Смаргонскага СПЦ.**

Весткі з месцаў

## ЧЫТАЛЬНЫ ДВОРЫК ПАД МЕСЯЦАМ

### падчас пандэміі адкрылі для малодых гараджан супрацоўнікі нашай бібліятэкі

Размясціўся ён на пляцоўцы раённага цэнтра рамёстваў, дзе роставыя драўляныя скульптуры суседнічалі з яркімі кніжнымі стэлажамі, каляровымі лавачкамі і столікамі з перыёдыкай. Пад лёгкае шамаценне кніжных і часопісных старонак, за кубачкам кавы ці гарбаты, пад гукі жывой музыкі там можна было шмат чаго пачуць і ўбачыць — змястоўна адпачыць... У аўтарскай апрацоўцы мясцовага фалькларыста Рамана Яраша гучалі кампазіцыі на словы Уладзіміра Караткевіча, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, у добрыя рукі прасіліся добрыя кнігі, прэзентаваліся найлепшыя апавяданні беларускіх аўтараў пра каханне, дзе змянілавсць яго, самага першага (паводле апавядання Леаніда Маракова) «ілюстраваў» тэатр «Жывая кніга».

У сатырычным ракурсе тэму кахання прадставіў тэатр інтэрмедыі «Паралонавае сэрца», а ўсю вечарыну разнастаілі конкурсы, гульнявыя экспромты, танцавальная размінка і сумеснае выкананне маладзёжных хітоў.

**Тамара КРУТАЛЕВІЧ,** *г. Беразіно.*

Наш чалавек!

## «ПРЫКЛАДАМ НЯСТОМНАСЦІ Ў ПРАЦЫ ДЛЯ МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ БЫЛА МАМА»

**У аграгарадку Крынкі, што ў Лёзненскім раёне, мне пашчасціла пазнаёміцца з жанчынай, якая, жывучы ў шматкватэрным доме, захапляецца...**

Зрэшты, па парадку.

Па адукацыі Галіна Леанідаўна Папова — бухгалтар, больш за 30 гадоў адпрацавала ў гандлі. Яна маладжавая, стыльная, сочыць за сабой. А яшчэ даглядае... свінак-парасят, козачак, курэй. У гэтым ёй дапамагае сям'я, інтэрнэт і набыты з дзяцінства вопыт.

Справа ў тым, што яе маці — Марыя Якаўлеўна Ігнатава — Герой Сацыялістычнай Працы, знакамітая свінарка саўгаса «Крынкі».

— Мы з сястрой — успамінае Галіна Леанідаўна, — дапамагалі ёй па гаспадарцы столькі, колькі помнім сябе, любілі ўсякую жывёлу... Я з сямі гадоў ездзіла конна, кіравала падводай... Аднойчы, помню, пачула, што ў вёсцы захварэла жанчына, і самавольна паехала па фельчарку, па «хуткую дапамогу»... І такі ж прывезла яе, хоць па дарозе мы перакуліліся... Атрымала тады ад бацькі. Але шчасце, што ўсё было не дарэмна... А потым, калі падрасла, спакойна адпускала маму куды-небудзь схадзіць ці з'ездзіць, — з гаспадаркай спраўлялася сама.

Таму, відаць, не дзіва, што ў 18, толькі скончыўшы школу бухгалтараў ды ўладкаваўшыся на работу, дзяўчына выйшла замуж за мясцовага хлопца Васіля Галцеева — сама стала гаспадыняй, а ў хуткім часе і маці. У сям'і ўсё добра было — гадаваліся дзве дачушкі Святлана і Таццяна...

Гора, як лічыць жанчына, ім прынёс Чарнобыль.





Муж, саўгасны кіроўца, быў камандзіраваны ў небяспечную зону, перавозіў адтуль людзей у суседнія Паловікі, пасля чаго захварэў на лейкоз і памёр. Яго жонка ў 27 гадоў засталася ўдавой, дзеці — сіротамі. І добра яшчэ, што побач жылі бацькі — без іх падтрымкі куды цяжэй было б перажыць непапраўнае, выгадаваць дачок.

А потым лёс падарыў гэтай жанчыне сустрэчу з Аляксандрам Паповым, які стаў для яе надзейнай апорай, а дзецям і наогул — замяніў бацьку. Клапатлівы і працавіты, Аляксандр Аляксандравіч падтрымлівае ўсе ідэі жонкі, адна з якіх ператварылася ў сапраўднае хобі: развядзенне свіней.

— Мне вельмі хацелася б атрымаць новыя пароды, — дзеліцца Галіна Леанідаўна. — Я маю сувязі з племянным прадпрыемствам, бяру там біялагічны матэрыял, сама (так, як вучыла мама), раблю асемяненне, прымаю апаросы... І ведаеце, так прыемна трымаць на руцэ новае жыццё! Парасяткі нараджаюцца і меншанькія, і большанькія... Затым, пры добрым доглядзе, выраўноўваюцца, хутка растуць, набіраюць вагу. Вельмі важна «пракалоць» іх вітамінамі і жалезам, тады яны будуць здаровенькія. У хляве ў нас ёсць спецыяльныя месцы з лямпамі для абагрэву — малыя спяць там... На дзясяты дзень даю ім прыкорм — смажанае зерне....

Усе свае назіранні гаспадыня заносіць у спецыяльны сшытак, потым зазірае ў яго, каб не пераблытаць, каму, што і калі, бо на падворку — тры свінаматкі, а было і больш — такіх парод, як ландрас, вялікая беларуская белая, п'етрэн, іаркшырская, кантор, дзюрок.

Сёлета гаспадары чакаюць прыплоду ад ландрасаў, пакрытых іаркшырскай і п'етрэнам. Галіна Леанідаўна кажа, што такія ім найбольш спадабаліся.

Кармы для свіней (камбікорм для рознага ўзросту, муку) разводчыкі купляюць звычайна ў віцебскіх крамах, бульбу, моркву, буракі ды гарбузы — у аднавяскоўцаў. З імі, бывае, і разлічваюцца не грашыма, а па так званым бартары — свінінай.

А вось малачко для парасят ёсць сваё — казінае.

— Як жа, — пытаюся ў гаспадыні, — вам удаецца сумяшчаць клопат пра сям'ю і дом з клопатам пра такую колькасць жывёлы?

На гэта Галіна Леанідаўна толькі ўсміхаецца. Кажа, што прыкладам нястомнасці ў працы ёй заўсёды служыла матуля... Да таго ж — ва ўсім дапамагае муж, дзеці, неўпрыкмет падраслі ўнукі і таксама ўжо нешта робяць.

— Ілья і Наста цяпер штодзень у мяне, — гаворыць бабуля. — Так склалася, што дачка пасля разводу з мужам выхоўвае іх адна, жыве ў Крынках — шукае работу. Яна скончыла ўніверсітэт імя Машэрава... А Святлана — медык, жыве ў Віцебску, гадуе двух хлопчыкаў. Старэйшаму ўжо 20, працуе поварам, малодшаму — 9. Яны не часта прыязджаюць, але мы з мужам усім бязмежна рады і, вядома ж, кожнаму хацелі б дапамагчы, зрабіць падарунак.

**Таццяна ІГНАЦЕНКА,**
*Лёзненскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4Б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: оборудование, бывшее в употреблении. Местонахождение: г. Борисов, ул. Даумана, 95**

| № лота | Инв. номер | Год выпуска | Наименование, модель оборудования | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 9101136 | 1993 | Пресс-автомат, 4ГЖ-500 | 3 763,26 |
| 2 | 8100638 | 1980 | Пресс-автомат, 2ПА-10 | 6 888,10 |
| 3 | 9030429 | 1996 | Бесцентрошлифовальный станок, САСЛЗ/1АД | 18 819,29 |
| 4 | 9101177 | 1996 | Машина литья под давлением, 711А08 | 5 751,80 |
| 5 | 9010437 | 1979 | Токарно-винторезный станок, 16УО4П | 1 348,62 |
| 6 | 9010839 | 1996 | Токарно-винторезный станок, 1К62Д | 5 751,80 |
| 7 | 9101170 | 1994 | Ножницы гильотинные, НК 3418 | 10 581,08 |
| 8 | 9020149 | 1978 | Радиально-сверлильный станок, 2М55 | 3 479,18 |
| 9 | 9070017 | 1970 | Поперечно-строгальный станок, 7Б-35 | 1 859,95 |
| 10 | 9020126 | 1974 | Горизонтально-расточной станок, 2622ВФ1 | 16 262,60 |
| 11 | 9010278 | 1973 | Токарно-винторезный станок, 16К-20 | 4 331,41 |
| 12 | 9070020 | 1970 | Вертикально-протяжной станок, МП-141-Н27 | 7 456,25 |
| 13 | 9030391 | 1991 | Плоскошлифовальный станок, ЗЛ 723 АФ 2И | 13 705,92 |
| 14 | 9101187 | 1996 | Вальцы гибочные, 33.047 | 3 479,18 |
| 15 | 9060192 | 1989 | Вертикально-фрезерный станок, FSS 400/1600E | 4 615,49 |
| 16 | 9100931 | 1988 | Пресс брикетировочный, Б6238 | 46 658,74 |
| 17 | 9060165 | 1985 | Вертикально-фрезерный станок, 6Р11 | 3 763,26 |
| 18 | 9060172 | 1986 | Вертикально-фрезерный станок, 6Т10 | 4 331,41 |
| 19 | 9060181 | 1987 | Горизонтально-фрезерный станок, 6Р81Г | 2 314,48 |
| 20 | 9060191 | 1989 | Вертикально-фрезерный станок, FSS 400/1600E | 4 615,49 |
| 21 | 9010836 | 1996 | Токарно-винторезный станок, 1К625Д | 5 467,72 |
| 22 | 4190193 | 2006 | Пылеулавливающий агрегат с вентилятором, ПУ-1500 | 922,50 |
| 23 | 9060234 | 2002 | Консольно-фрезерныи станок, Ф-32Ш | 22 512,28 |
| 24 | 9020371 | 1995 | Координатно-расточной станок, 2431СФ10 | 31 293,55 |
| 25 | 9030375 | 1990 | Профилешлифовальный станок, 3951 ВФ 1 | 12 285,54 |
| 26 | 9060182 | 1987 | Универсально-фрезерный станок, 6Т80Ш | 3 763,26 |
| 27 | 9060193 | 1989 | Вертикально-фрезерный станок, 6Т10 | 4 331,41 |
| 28 | 9030158 | 1975 | Плоскошлифовальный станок, 3Г-71М | 6 035,87 |
| 29 | 9060203 | 1989 | Универсально-фрезерный станок, 6Т80Ш | 3 763,26 |
| 30 | 9030091 | 1969 | Плоскошлифовальный станок, 3Г71 | 6 035,87 |
| 31 | 9060184 | 1988 | Вертикально-фрезерный станок, 65А60Ф1-11 | 25 068,98 |
| 32 | 9010480 | 1981 | Токарно-винторезный станок, 16К25 | 8 024,44 |
| 33 | 9100148 | 1967 | Гидропресс для пластмасс, ПД-476 | 5 183,68 |
| 34 | 9100163 | 1967 | Гидропресс для пластмасс, ПД-476 | 5 183,68 |
| 35 | 9100912 | 1988 | Пресс гидравлический, ДГ2432А | 9 160,74 |
| 36 | 9100913 | 1990 | Пресс гидравлический, ДГ2432 | 9 160,74 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

**Задаток 10 % от начальной цены лота**
перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 (три) процента** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих дней** после проведения электронных торгов

**Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия**

**Дата, место и время проведения электронных торгов**
**Начало торгов: 13.00 07.09.2020 г. Окончание торгов: 14.00 07.09.2020 г. на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.09.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
